

КАЛЯДНАЕ ДЗЯЦІНСТВА: ЯКІМ ЯНО БЫЛО 5

ДОБРЫЯ СПРАВЫ СВАІМІ РУКАМІ МС





Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 СНЕЖНЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 246 (28862)



9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ШАРСНЁЎ, старшыня Віцебскага аблвыканкама:**

*«У вобласці забяспечана станоўчая дынаміка сацыяльна-эканамічнага развіцця. У параўнанні з пачаткам года колькасць неэфектыўна працуючых арганізацый скарацілася ўдвая, іх удзельная вага знізілася з 29 % да 16 %. Стабілізавалася сітуацыя з разлікамі. Забяспечана станоўчая дынаміка росту заработнай платы. Сітуацыя на рынку працы не выйшла за рамкі прагназуемай: узровень беспрацоўя на 1 лістапада склаў 0,5 % пры сацыяльна дапушчальным не больш за 1 %. Па выніках работы за год плануецца працаўладкаваць на новыя рабочыя месцы больш за 6,5 тысячы чалавек. У прамысловасці забяспечаны рост аб'ёмаў вытворчасці па індэксе фізічнага аб'ёму. Станоўчы ўклад у фарміраванне ВРП уносіць сельская гаспадарка. Тэмп росту яе валавой прадукцыі за студзень — лістапад 2018 года склаў 100,7 %».*

# АЛІСА І ЯЕ ЛІЗА




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Аліса — гэта падобны на лісу звычайны «двортэр'ер». А мінскі культуролаг Лізавета КОЗЫРАВА — яе гаспадыня і выратавальніца. Два гады назад ад сабакі адмовіліся гаспадары, і ён трапіў у прытулак для бадзяжных жывёл. Ліза, якая часта дапамагае валанцёрам, убачыўшы няшчасную ад чалавечай здрады Алісу, забрала яе дамоў. І не прагадала — такую безумоўную любоў і адданасць сярод людзей нячаста сустрэнеш.**

## КОРАТКА

- **Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь з 20 снежня 2018 года выпускае ў абарачэнне памятныя манеты «Свет вачыма дзяцей. 2018».**
- Мінскі аўтазавод сабраў першы спартыўны грузавік з капотнай кампаноўкай.



- **Мінск зрабіў заяўку на правядзенне чэмпіяната Еўропы па лёгкай атлетыцы ў 2024 годзе.**

## «Фарміраванне заканадаўчай базы для ўстойлівага развіцця — галоўная задача парламента»

*Выступленне старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь М. У. Мясніковіча на закрыцці пятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання*

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Паважаныя запрошаныя!



Сёння завяршаецца пятая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання. У ходзе пасяджэнняў сесіі Савет Рэспублікі адобрыў 42 законапраекты.

Законапраекты, якія былі падтрыманы на гэтай сесіі, ствараюць дадатковыя прававыя ўмовы для ўстойлівага развіцця краіны. Напрыклад, важныя папраўкі для інвестара замацаваны ў законапраекце «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці і пераўтварэнні дзяржаўных унітарных прадпрыемстваў у адкрытыя акцыянерныя таварыствы», які мы адобрылі ўчора.

Бюджэт на 2019 год і новая рэдакцыя Падатковага кодэкса, якія прыняты парламентам, з'яўляюцца вельмі адказнымі нарматыўнымі актамі, гэта, па сутнасці, эканамічныя інструменты развіцця краіны ў наступным годзе і на перспектыву.

СТАР. 3

## Адпавядаць дынамізму часу

*Выступленне старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. П. Андрэйчанкі на закрыцці пятай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання*

Паважаныя дэпутаты, члены ўрада і запрошаныя!

Пятая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання завяршае сваю работу.

Перыяд развіцця, які перажывае сёння краіна, вельмі дынамічны. Прынцыпова змяняюцца падыходы да кіравання эканомікай, ідзе актыўны пошук новых ідэй і рэсурсаў эканамічнага росту.



Буйныя інвестпраекты, малы і сярэдні бізнес, актыўнае ўкараненне лічбавых тэхналогій і развіццё сферы паслуг закліканы стаць тымі драйверамі, якія выведуць на якасна новы ўзровень эканоміку і, як следства, дабрабыт грамадзян Беларусі.

Зразумела, усе гэтыя пытанні патрабуюць свайго заканадаўчага праламлення. І дэпутаты імкнуліся, каб рашэнні, прынятыя на сесіі, адказвалі дынамізму часу і тым задачам, якія ставіць кіраўнік дзяржавы па фарміраванні новых эканамічных адносін.

З гэтых пазіцый мы падыходзілі да разгляду пакета бюджэтна-падатковых дакументаў. Бюджэт рэспублікі на 2019 год звярстаны менавіта з улікам задач па росце даходаў насельніцтва, павышэнні аддачы ад дзяржпадтрымкі і рацыянальным кіраванні дзяржаўным доўгам. Усё гэта накіравана на ўмацаванне макраэканамічнай стабільнасці, забеспячэнне збалансаванага росту заробкаў і павышэнне сацыяльнай абароны насельніцтва.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ!**

**Працягваецца падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2019 года!**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

# «ТРЭБА ВЯРТАЦЬ ЛЮДЗЯМ ГОРАД»

## Прэзідэнт правёў нараду па развіцці Мінска

**Разглядзелі пытанні эканомікі, камфортнага гарадскога асяроддзя, транспарту, лічбавай трансфармацыі і іншыя.**

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што было зроблена ў сталіцы за апошнія гады, і перайшоў да надзённых пытанняў. «Гораду і Мінскай вобласці пры каардынацыі ўрада неабходна распрацаваць і заканадаўча замацаваць планы па развіцці прыгарадных зямель. Вызначыць у іх функцыянальнае назначэнне тэрыторый з прадуманым заніраваннем і ўлікам інтэнсіўнасці іх выкарыстання. Увязка планаў развіцця двух адміністрацыйных адзінак — гэта аснова. Пакуль у гэтым пытанні шмат бессістэмнасці, і нават я б сказаў, хаатычнасці», — сказаў Прэзідэнт.

### ЭКАНОМІКА НАЙПЕРШ

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што некалькі гадоў таму была дамоўленасць развіваць гарады-спадарожнікі: Дзяржынск, Заслаўе, Лагойск, Смалявічы, Фаніпаль і Рудзенск. Аднак з 2012 года справа не прасунулася далей аднаго здадзенага дома ў Смалявічах. «Яна і не зрушыцца, калі Дзяржаўная праграма па вынасе вытворчых аб'ектаў правалена. А перанос запланаваных 12 прадпрыемстваў (напрыклад, «Беларускія шпалеры», абутковая фабрыка «Прамень», Мінскі завод ацяпляльнага абсталявання, іншыя) прыцягнуў бы ў рэгіёны рабочую сілу», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу таксама на недастатковае развіццё транспартную сувязь з гарадамі-спадарожнікамі.

«Можа, у новага мэра ёсць альтэрнатыўныя думкі? Хацелася б пачуць, якім ён бачыць рашэнне гэтых пытанняў з улікам усталяванага парога ў два мільёны чалавек. Пераступіць яго нельга. Гэта не капрыз, а ўмова камфортнага жыцця людзей», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да старшыні Мінгарвыканкама Анатоля Сівака.

На думку Прэзідэнта, праблему перанаселення магчыма вырашыць толькі ва ўвязцы з пытаннямі эканамічнага развіцця горада.

Кажучы пра даходы, кіраўнік дзяржавы паставіў задачу перад урадам: «Структура бюджэтных даходаў павінна быць менш залежнай ад імпарту з улікам прыбытковасці бізнесу ў горадзе, кошту зямельных участкаў, узроўню даходаў». Нягледзячы на тое што жыхары сталіцы традыцыйна больш забяспечаныя, 20 % мінчан дагэтуль атрымліваюць менш за 400 рублёў на месяц. «Таму задача па павышэнні заробкаў нізкааплатных катэгорый работнікаў актуальная і для Мінска. Тым больш што цэны на тавары і паслугі тут самыя высокія ў краіне», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. За дзве з паловай пяцігодкі гандлёвыя плошчы павялічыліся амаль у тры разы. Аднак такая маштабная канкурэнцыя, па словах кіраўніка дзяржавы, слаба ўплывае на сітуацыю з цэнамі. Па-ранейшаму рэальных зніжак няма або яны сімвалічныя, а заходнееўрапейскі шопінг у мінчан лічыцца больш прыцягальным. «Задача для гарадскай улады — стварыць такія ўмовы, каб людзям хацелася траціць грошы ў сваім горадзе», — рэзюмаваў Прэзідэнт. Пры гэтым ён падкрэсліў, што нельга страціць крамы крокавай даступнасці, і ніякай манаполіі быць не можа.

### АСЯРОДДЗЕ КАМФОРТНАЕ І РАЗУМНАЕ

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што далейшае развіццё Мінска павінна праходзіць перш за ўсё за кошт рэканструкцыі існуючых тэрыторый, а не новага будаўніцтва. «Пачынае з'яўляцца хвароба нераўнамернай транспартнай нагрузкі. Асобныя вуліцы, развязкі проста задыхаюцца. Неабходныя недарагія, але прадуманыя рашэнні. Пры гэтым замахвацца на зялёныя насаджэнні нават і не думайце», — у вырашэнні праблемы кіраўнік дзяржавы разлічвае на Анатоля Сівака як на былога міністра транспарту і камунікацый.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў мэра Мінска павінна быць выбудавана эфектыўная сістэма своечасовага рэагавання на праблемы. Гаворачы пра водазабеспячэнне горада, ён падкрэсліў, што ў сталіцы сёння трэць крыніц — паверхневыя. Па планах да сярэдзіны наступнай пяцігодкі (крайні тэрмін — 2025 год) поўнасцю перавесці ўсё водазабеспячэнне на падземныя крыніцы.

Таксама кіраўнік дзяржавы адзначыў, што і раку Свіслач, яе прытокі і тэрыторыі, якія да яе прылягаюць, неабходна прывесці ў належны санітарна-гігіенічны стан. Патрабуе асаблівай увагі экалагічная абстаноўка ў цэлым. Падрабязней Аляксандр Лукашэнка спыніўся на зборы, перапрацоўцы і захаванні цвёрдых бытавых адходаў. На яго думку, неабходна арганізаваць асобны збор і сыходзіць ад пластыку да шкла. Гэта сусветная тэндэнцыя.

Поўнай праблемай для сталіцы з'яўляецца і канцэнтрацыя транспарту ў цэнтры, загрузка ў гадзіны пік. «Трэба вяртаць людзям горад. Ён павінен быць зручным для перамяшчэння перш за ўсё на грамадскім транспарце, электрасамакатах, роварах», — растлумачыў Прэзідэнт, пры гэтым падкрэсліўшы, што актыўнасць мясцовых улад у развіцці інфраструктуры адстала ад надзённых патрабаванняў як мінімум на некалькі гадоў.

«Мы ўзялі курс на IT-краіну. І гарады, у першую чаргу сталіца, павінны адпавядаць гэтаму статусу. У Мінска ёсць усе рэсурсы, каб хутчэй за іншыя справіцца з задачамі лічбавай трансфармацыі і пераўтварэння ў «разумны горад», — лічыць Аляксандр Лукашэнка. Для гэтага неабходна распрацаваць канцэпцыю прынамсі на пяцігадовую перспектыву.

Падрабязней Прэзідэнт спыніўся на архітэктуры сталіцы. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў сабраць групу архітэктараў, якія змогуць распрацаваць канцэпцыю горада. Неабходна заняцца яго знешнім воблікам. На думку кіраўніка дзяржавы, не варта планаваць вышынныя забудовы, лепш вярнуцца да традыцыйных памераў, якія пасуюць Мінску.

Наконт зялёных зон Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што трэба ўсюды, дзе магчыма, саджаць дрэвы, заняцца азеляненнем ландшафтных зон. Гэта таксама ўплывае на імідж сталіцы, як і элементы ўпрыгожвання будынкаў, аўтобусных прыпынкаў, падсветкі... — важна ўсё.

Наступны год асаблівы — сталіца правядзе Другія Еўрапейскія гульні. Як сказаў кіраўнік дзяржавы, укладваць у гэту падзею будуць не толькі сродкі, але і душу. «Гэта беларуская «Алімпіяда», менавіта так яна будзе ўсімі ўспрымацца. Чатыры тысячы спартсменаў, дзве тысячы трэнераў, сотні тысяч балельшчыкаў. Кожны метр гарадскога асяроддзя павінен працаваць на гасцей і ўдзельнікаў гэтай спартыўнай падзеі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

### ДАСТУПНЫ ДЛЯ ЎСІХ

Сёння ў Мінску жыве каля 125 тысяч людзей з інваліднасцю — амаль чвэрць ад агульнай колькасці па краіне. Аляксандр Лукашэнка цвёрда сказаў: «Горад Мінск павінен стаць эталонам па ўладкаванні безбар'ернага асяроддзя на ўсіх аб'ектах». Зараз доступ ёсць толькі крыху больш чым да траціны будынкаў. Работу па стварэнні безбар'ернага асяроддзя неабходна вывесці на новы якасны ўзровень, у першую чаргу гэта датычыцца транспарту і аб'ектаў масавага знаходжання людзей.

Да таго ж кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на сталае насельніцтва: у сталіцы пражывае амаль 160 тысяч чалавек старэйшых за 70 гадоў, з іх прыкладна кожны сёмы — адзінокі. «Людзі, якія не маюць блізкіх сваякоў, павінны быць акружаны клопатам дзяржавы», — сказаў Прэзідэнт. Асаблівая ўвага павінна быць аддадзена і ветэранам.

У сталіцы таксама яшчэ не знятая праблема перапоўненасці дашкольных устаноў і школ. На сотню месцаў прыходзіцца 117 дзетак. Некаторыя школы перагружаны ўдвая. Мінску неабходна яшчэ каля 20 дзіцячых садкоў і сямі школ. Туды ж патрэбны і кадры: на сёння вакантнымі застаюцца месцы амаль 300 выхавальнікаў і 160 педагагічных супрацоўнікаў.

«Вы павінны аб'явіць бескампрамісную барацьбу бюрократыі і карупцыі, паколькі адно параджае другое», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да актыву горада. На думку кіраўніка дзяржавы, неабходна сфарміраваць эфектыўны апарат Мінгарвыканкама, асаблівую ўвагу аддаць падбору і расстаноўцы кадраў па прыярытэтных кірунках. Пакуль што Прэзідэнт не задаволены работай гарадскіх улад.

Таксама Аляксандр Лукашэнка казаў пра тое, што трэба актыўна прыцягваць неабыякавых грамадзян да рашэння праблем горада.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

## Парламенцкі дзённік

# НАДЗЕІ І АБАВЯЗКІ

### ДЭПУТАТЫ І СЕНАТАРЫ ЗАВЯРШЫЛІ ГОД

**Учора адбылося закрыццё сесій у ніжняй і верхняй палатах беларускага парламента. Акрамя таго, на сумесным пасяджэнні перад дэпутатамі і членамі Савета Рэспублікі выступіў віцэ-прэм'ер Ігар Ляшэнка. Ён расказаў пра вынікі работы і кірункі развіцця прамысловага і паліўна-энергетычнага комплексу краіны.**

### Захаваць устойлівасць

Намеснік прэм'ер-міністра паведаміў, што ў краіне забяспечана эканамічная раўнавага ў цэлым: курс рубля ўстойлівы, крэдыты сталі больш даступныя, узровень заробкаў дазваляе падтрымліваць попыт на айчынныя прадукты.

Прамысловы сектар Беларусі развіваецца хутчэй, чым у іншых краін ЕАЭС. Мы не толькі вырабілі сёлета больш, але і лепш прадавалі сваю прадукцыю. Запасы гатовай прадукцыі складаюць менш за 60 % да сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці, і гэта найменшы паказчык за шэсць апошніх гадоў.

Асобна віцэ-прэм'ер спыніўся на рызыках у нафтагазавай сферы, якія звязаны з пачаткам у Расійскай Федэрацыі падатковага манеўру. У выніку два нафтаперапрацоўчыя заводы Беларусі ў наступным годзе не далічацца 240 мільёнаў долараў, бюджэт не атрымае падаткаў на суму 143 мільёны долараў. Акрамя таго, нафтапрадукты ў Беларусі могуць падаражэць на 5—7 % і аказацца даражэйшымі за расійскія. Таму перамовы з Расійскай Федэрацыяй працягваюцца.

Ігар Ляшэнка паведаміў, што ў наступным годзе плануецца запусціць першы энергаблок Беларускай атамнай электрастанцыі магутнасцю 1170 мегават. Ён нагадаў, што ўвод БелАЭС дазволіць замясціць да 5 мільярдаў кубічных метраў імпартуемага прыроднага газу і знізіць яго долю ў паліве на вытворчасць энергіі з 95 да 60 %. Акрамя таго, на 10 мільёнаў тон зменшыцца выкід парніковых газаў штогод і знізяцца выдаткі на вытворчасць электраэнергіі.

«Сёння створаны дастатковыя перадумовы для ўстойлівага развіцця прамысловага і энергетычнага комплексу краіны, што павінна адыграць вызначальную ролю ў дасягненні пастаўленых прагнозных паказчыкаў як на 2019 год, так і на ўсю бягучую пяцігодку», — запэўніў народных абраннікаў Ігар Ляшэнка.

### Савет Рэспублікі ўхваліў «бюджэтны пакет»

Асноўным «ньюсмэйкерам» падчас работы над прыняццем бюджэту стаў міністр ведамства, якое падрыхтавала дакумент, **Максім ЕРМАЛОВІЧ.** Ён расказаў, куды пойдзе сёлетні прафіцыт:

— На сённяшні дзень Міністэрствам фінансаў падрыхтаваны праект указа кіраўніка дзяржавы па ўдакладненні паказчыкаў бюджэту 2018 года. Мы чакаем, што частка прафіцыту будзе накіравана на рашэнне тых задач, якія ўзнікалі на працягу года. І частка прафіцыту таксама будзе накіравана на пагашэнне даўгавых абавязацельстваў з апярэджаннем графіка.

Прафіцыт павінен скласці менш за 2 % ад ВУП. Па словах Максіма Ермаловіча, чакаецца ў наступным годзе і павышэнне тарыфнай стаўкі першага разраду на 5,5 %. Пры гэтым дадатковыя меры будуць рэалізаваны ў адносінах да нізкааплатных катэгорый насельніцтва для павышэння іх заробкаў.

**Марыя ДАДАЛКА,**
**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЗША прыступаюць да поўнага вываду войскаў з Сірыі



Адпаведны загад аддаў прэзідэнт краіны, паведамляе Bloomberg са спасылкай на афіцыйнага прадстаўніка ў Вашынгтоне. Паводле слоў Дональда Трампа, рашэнне аб вывадзе войскаў было прынята яшчэ ў аўторак. У адпаведнасці з ім гэтую блізкаўсходнюю краіну «хутка» і «цалкам» пакінуць больш за дзве тысячы амерыканскіх вайскоўцаў, якія займаюцца трэніроўкай мясцовых фарміраванняў для барацьбы з тэрарыстычнай групоўкай «Ісламская дзяржава» (ІД), перадае «Інтэрфакс». Раней Дональд Трамп заявіў, што ЗША разграмілі сілы ІД у Сірыі і што амерыканскія ваенныя знаходзяцца там толькі дзеля гэтай мэты. Bloomberg мяркуе, што рашэнне прэзідэнта аб вывадзе войскаў заспела знянацку нават кіраўніцтва Пентагона. Міністр абароны ЗША Джэймс Мэціс сказаў 6 снежня, што ў Сірыі перад амерыканскімі ваеннымі стаяць вялікія задачы. Ён таксама адзначыў, што ядро ІД па-ранейшаму функцыянуе, імкнучыся вярнуць сабе ўплыў як у Сірыі, так і ў астатнім свеце. Прадстаўнік Белага дома Сара Сандэрс растлумачыла вывад войскаў «пераходам да наступнай фазы кампаніі». Яна таксама запэўніла, што Вашынгтон і яго саюзнікі будуць гатовыя, у выпадку неабходнасці, зноў абараняць амерыканскія інтарэсы ў Сірыі. Вывад войскаў можа негатыўна адбіцца на становішчы курдаў, узброеныя фарміраванні якіх падтрымліваюць амерыканцы. Баявыя дзеянні з курдамі вядуць турэцкія войскі, паколькі Анкара лічыць іх тэрарыстамі. Трамп раней абяцаў завяршыць кампанію супраць «Ісламскай дзяржавы», выказваючы сумненне ў неабходнасці выдаткаў на яе. «Мы сыдзем з Сірыі, вельмі хутка, — казаў ён вясной. — Я хачу сысці. Я хачу вярнуць нашы войскі дадому».

### Кошт нафты абваліўся



Цэны на «чорнае золата» апусціліся ніжэй псіхалагічнай адзнакі ў 55 долараў за баррэль упершыню з верасня 2017 года, сведчаць даныя лонданскай біржы ICE. Так, у ходзе таргоў 20 снежня кошт ф'ючарса на нафту маркі Brent з пастаўкай у лютым 2019 года апускаўся на 3,93 працэнта, а на нафту маркі WTI — больш чым на 4,07 працэнта. Пры гэтым у сераду расцэнкі на сыравіну абедзвюх марак кароткачасова падскоквалі больш чым на 3,3 працэнта, карэктуючыся пасля падзення аўторка на пяць працэнтных пунктаў. На рынку захоўваюцца асцярогі празмернасці аб'ёму нафты на фоне павелічэння здабычы ў ЗША і прыкмет запавольвання росту сусветнай эканомікі. Па звестках Мінэнерга Злучаных Штатаў, здабыча «чорнага золата» ў краіне на мінулым тыдні засталася на ўзроўні 11,6 мільёна барэляў у дзень. Пры гэтым камерцыйныя запасы нафты ў краіне скараціліся ўсяго на 500 тысяч барэляў, хоць аналітыкі чакалі зніжэння на 2,4 мільёна барэляў. Члены Арганізацыі краін — экспарцёраў нафты (АПЕК) раней дамовіліся аб скарачэнні ўзроўню здабычы нафты ў 2019 годзе на 1,2 мільёна барэляў у суткі. Аднак рынак не верыць у здольнасць новай дамовы АПЕК збалансаваць сітуацыю на фоне таго, што найбуйнейшы вытворца нафты ў свеце — ЗША — не мае намеру спыняцца.

# «Фарміраванне заканадаўчай базы для ўстойлівага развіцця — галоўная задача парламента»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У праекце бюджэту на 2019 год пашырана аўтаномія рэгіёнаў і прадугледжана яшчэ большая самастойнасць мясцовых бюджэтаў. Прапановы Савета Рэспублікі як палаты рэгіянальнага прадстаўніцтва па гэтых пытаннях у асноўным падтрыманы.

На гэтай сесіі Савет Рэспублікі адобрыў законапраект, які прадугледжвае ўнясенне змяненняў і дапаўненняў у Крымінальны, Крымінальна-працэсуальны і Крымінальна-выканаўчы кодэксы, Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях, Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях. Такі падыход адпавядае Дэкрэту № 7 і ўстаноўкам кіраўніка дзяржавы, накіраваным на больш ліберальныя рынкавыя ўмовы для бізнес-супольнасці. Лічу, што супрацоўнікі Сакратарыята Савета Рэспублікі сумесна з прадстаўнікамі навукі і бізнесу добра папрацавалі над папраўкамі ў Грамадзянскі кодэкс у мэтах павышэння інвестыцыйнай прывабнасці краіны. Мяркуем, што гэты праект у наступным годзе ўрад унясе ў Палату прадстаўнікоў.

Паважаныя калегі!

Працягвалася актыўная міжнародная дзейнасць Савета Рэспублікі.

29 лістапада парламенцкая дэлегацыя Рэспублікі Беларусь пад маім кіраўніцтвам прымала ўдзел у планавых восеньскіх мерапрыемствах МПА СНД.

Паступальна развіваецца дыялог Савета Рэспублікі са структурамі Савета Еўропы. У Мінску ў верасні прайшоў шэраг мерапрыемстваў па пытаннях развіцця мясцовага кіравання і самакіравання. Пастаянная камісія па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні пад кіраўніцтвам А. А. Папкова зрабіла ўсё магчымае, каб мясцовыя ўлады папоўнілі свае веды.

Станоўчы рэзананс меў візіт старшыні Сената парламента Рэспублікі Казахстан К.-Ж. К. Такаева. Падпісана пагадненне, створана падкамісія па супрацоўніцтве ў інавацыйнай сферы.

11 лістапада ўпершыню за ўсю гісторыю беларуска-французскіх стасункаў адбыўся візіт старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Сенат Французскай Рэспублікі. Да гэтага мерапрыемства бакі рыхтаваліся — створаны сенацкія камісіі па супрацоўніцтве, зацверджаны іх персанальныя склады.

У мэтах развіцця пастаянных сувязяў паміж парламентамі ў рамках візітаў дэлегацый Ірана, Турцыі, Егіпта падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Традыцыйна снежань — час для пастаноўкі мэтавых задач на наступны год і на перспектыву.

У 2019 годзе Савету Рэспублікі трэба вельмі адказна папрацаваць над праектам асноўных палажэнняў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2025 года і над заканадаўчай базай па іх выкананні. Таму вам, сенатары, хто працуе на пастаяннай аснове, а таксама Сакратарыяту Савета Рэспублікі трэба неадкладна і сур'ёзна весці напрацоўку ў гэтым кірунку. Вельмі шмат даручэнняў і іншых вострых праблем, вырашэнне якіх нельга адкладаць, як кажуць, на заўтра.

Улічваючы неабходнасць безумоўнага выканання мэтавых задач і ўстановак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі, трэба завяршыць разгляд парламентам законапраектаў, неабходных для рэалізацыі Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 23 лістапада 2017 г. № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва». Вы ведаеце, што гэта даручэнне знаходзіцца на асаблівым кантролі кіраўніка дзяржавы.

Лічу, што для гэтага неабходна больш актыўна задзейнічаць патэнцыял навукоўцаў і экспертаў. У нас створаны і працуе навукова-кансультатыўны савет пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі. Пажаданне — патрэбна зрабіць яго дзейнасць больш эфектыўнай. Буду ўдзячны, калі вырашэнне гэтай няпростай задачы ўзначаліць шаноўная Мар'яна Акіндзінаўна Шчоткіна.

У 2019 годзе мы павінны з мясцовымі Саветамі і Палатай прадстаўнікоў завяршыць арганізацыйную работу па стварэнні беларускага маладзёжнага парламента. Спадар Сірэнка мае пэўныя думкі на гэты конт.

Звяртаюся ў першую чаргу да Брэсцкага, Гомельскага і Магілёўскага абласных Саветаў дэпутатаў. Неабходна ў найбліжэйшы час сфарміраваць абласныя маладзёжныя парламенты, каб на роўных умовах вылучаць сваіх прадстаўнікоў у рэспубліканскую структуру.

Шаноўнае спадарства!

Парламенцкаму Сходу Саюза Беларусі і Расіі мэтазгодна працягваць наступальную дзейнасць па рэалізацыі ініцыятыў Савета Рэспублікі па маніторынгу Дагавора аб Саюзнай дзяржаве, распрацоўцы Канцэпцыі збліжэння заканадаўства Беларусі і Расіі, уніфікацыі нацыянальнага заканадаўства і ўзмацненні ролі Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы. Ала Мікалаеўна Бодак выпрацавала шмат ініцыятыў у гэтым кірунку і, лічу, зможа спрыяць прыняццю прынцыповых рашэнняў.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Дазвольце падзякаваць вам за сумесную плённую работу ў перыяд сесіі, павіншаваць з надыходзячымі Калядамі і Новым годам, пажадаць вам і вашым блізкім дабрабыту, міру і здароўя.

У адпаведнасці з артыкулам 95 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь пятую сесію Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання аб'яўляю закрытай.

# Адпавядаць дынамізму часу

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З улікам прапаноў бізнес-супольнасці быў сур'ёзна перапрацаваны Падатковы кодэкс. Спрошчаны многія адміністрацыйныя працэдуры, парадак узаемадзеяння плацельшчыкаў з падатковымі органамі. Забяспечана і некаторае зніжэнне падатковай нагрузкі на суб'екты гаспадарання.

Разам з тым работу па стварэнні новага дзелавога клімату неабходна працягваць. Падатковае заканадаўства павінна пасляглоўна станавіцца ўсё больш ёмістым, празрыстым і зразумелым для ўдзельнікаў эканамічнага жыцця, ствараць прывабныя ўмовы для легальнай дзейнасці і не правакаваць прадпрымальнікаў адводзіць свой бізнес у цень.

Адно з ключавых месцаў у нашым парадку занялі пытанні прыцягнення ў нацыянальную эканоміку замежнага капіталу і развіцця дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Дадатковыя магчымасці для іх вырашэння створаны з прыняццем законапраектаў, якія датычацца інвестыцый і прыватызацыі, дарожнай дзейнасці.

Аднак ужо сёння мы бачым новыя пункты прыкладання сваіх сіл у гэтых абласцях. Вызначыць іх дапамагло правядзенне парламенцкіх слуханняў па інвестыцыйнай праблематыцы. Але, каб рэкамендацыі, прынятыя па іх выніках, не засталіся на паперы, нам трэба ўзмацніць узаемадзеянне з урадам, мясцовымі органамі ўлады, бізнес-супольнасцю і крок за крокам дамагацца пастаўленых мэт.

У ходзе сесіі народны са спрашчэннем некаторых умоў ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці зроблены і шэраг сур'ёзных захадаў па яе дэкрыміналізацыі. З Крымінальнага кодэкса, напрыклад, знікнуць такія паняцці, як ілжэпрадпрымальніцтва, незаконная прадпрымальніцкая дзейнасць і пакаранне ў выглядзе канфіскацыі. Істотна павышаны парогі шкоды, з якіх наступае крымінальная адказнасць. Акрамя таго, за злачынствы ў сферы эканомікі, што не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі, учыненыя ўпершыню, не будзе ўжывацца такая мера, як пазбаўленне волі. Гэта зроблена перш за ўсё для таго, каб неістотныя памылкі суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу не сталі фатальнымі для прадпрымальнікаў і службовых асоб прадпрыемстваў.

Словам, прасторы для манеўру ў прадпрымальнікаў становіцца больш, што дазволіць, дарэчы, больш эфектыўна выкарыстоўваць магчымасці развіцця прамых сувязяў з прадстаўнікамі замежнага бізнесу, якія адкрываюцца ў сувязі з правядзеннем беларуска-расійскіх і беларуска-ўкраінскіх форумаў рэгіёнаў. Але гэта далёка не канец. У нас створаны нядрэнны зачын па паляпшэнні прававога поля ў гэтай сферы. І я прашу профільныя камісіі трымаць рэалізацыю ўсіх гэтых напрацовак на асаблівым кантролі.

На сесіі прыняты і шэраг значных рашэнняў у галіне сацыяльнай палітыкі дзяржавы. Рэалізавана некалькі важных дэпутацкіх ініцыятыў у сферы экалогіі і прыродакарыстання. На чарзе — работа яшчэ над цэлым пакетам дакументаў, непасрэдна накіраваных на павышэнне якасці жыцця.

Зразумела, у першую чаргу якасць жыцця вызначаецца ўзроўнем эканамічнага дабрабыту. Стварэнне стабільнага асяроддзя для доўгатэрміновых інвестыцый — гэта неабходная ўмова даверу замежных дзелавых колаў да Беларусі і жадання рабіць тут бізнес. А гэта, у сваю чаргу, прадугледжвае надзейнае забеспячэнне законнасці, правапарадку, грамадзянскага міру і грамадскай згоды ўнутры краіны.

У святле нарастання сусветнай напружанасці здольнасць дзяржавы вырашаць гэтыя задачы значна вырастае ў цане. Менавіта таму Беларусь у апошнія гады ўсё часцей выбіраецца ў якасці пляцоўкі для абмеркавання сур'ёзных пытанняў рэгіянальнага і глабальнага парадку дня.

Дзякуючы ўмацаванню іміджу Беларусі і яе парламента на міжнароднай арэне прыкметна змяніліся дынаміка і якасць нашых двухбаковых кантактаў. Важна, што ў рабоце парламенцкіх груп дружбы пачынае пераважаць канкрэтыка. Па-дзеламу абмяркоўваюцца пытанні пашырэння бізнес-сувязяў, нарошчвання гандлёвага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва. Асабліва паказальныя тут вынікі кантактаў з нашымі калегамі з Германіі, Чэхіі і Швейцарыі.

Чым больш еўрапейскія палітыкі адкрываюць для сябе Беларусь, тым больш яны бачаць перспектыў для ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Гэта, дарэчы, пацвярджае і развіццё нашага дыялогу з прадстаўнікамі Еўрапарламента.

Не менш пазітыўныя тэндэнцыі адзначаюцца і на іншых вектарах міжпарламенцкага супрацоўніцтва. У гэтым плане трэба адзначыць некалькі знакавых падзей, і перш за ўсё афіцыйныя візіты ў Рэспубліку Беларусь егіпецкай і турэцкай парламенцкіх дэлегацый.

Візіт старшыні парламента Егіпта ў Мінск стаў першым за ўсю гісторыю беларуска-егіпецкіх адносін. Важным яго вынікам стала падпісанне Пагаднення аб міжпарламенцкім супрацоўніцтве. Сумесную заяву, якая спрыяе паглыбленню сувязяў і кантактаў паміж органамі заканадаўчай улады, мы падпісалі і з Турцыяй. Такім чынам, наша дагаворная база папоўнілася адразу двума дакументамі. А ўсяго іх колькасць набліжаецца ўжо да 50.

Такога роду дамовы з'яўляюцца вельмі эфектыўным інструментам развіцця супрацоўніцтва не толькі ў палітычнай, але і ў эканамічнай сферах. Мы ўсе выдатна разумеем, наколькі важныя для Беларусі дыверсіфікацыя рынкаў збыту айчыннай прадукцыі і пошук новых гандлёвых партнёраў. Дзякуючы Мемарандуму аб супрацоўніцтве з парламентам Судана нам удалося аб'яднаць свае намаганні па рэалізацыі волі лідараў дзвюх нашых дзяржаў па рашэнні гэтых задач.

Нядаўняя сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Судана вывела адносіны паміж дзвюма краінамі на стратэгічны ўзровень, пра што кажуць заключэнне кантрактаў на чвэрць мільярда долараў і падпісанне вялікага пакета міжурадавых пагадненняў.

Безумоўна, дэпутатам трэба далучыцца да выканання гэтых дамоўленасцей. Пра гэта, у прыватнасці, мы гаварылі на сустрэчы з прэзідэнтам Судана. Мы таксама пагадзіліся, што развіццё нашых адносін будзе спрыяць наладжванне дыялогу з Панафрыканскім парламентам.

Актыўна мы працуем і ў рамках еўразійскага міжпарламенцкага дыялогу. У гэтым плане хацеў бы адзначыць вынікі трэцяй Нарады спікераў парламентаў краін Еўразіі, якая прайшла сёлета ў кастрычніку ў Турцыі. Гэтая пляцоўка дазваляе нам абмяркоўваць прынцыповыя пытанні забеспячэння міру, бяспекі, стабільнага развіцця рэгіёна і з'яўляецца досыць эфектыўнай платформай нарошчвання эканамічнага супрацоўніцтва.

Наступная нарада пройдзе ў Астане. І на сустрэчы са старшынёй Сената парламента Казахстана, які знаходзіўся ў Мінску ў сувязі з удзелам у сустрэчы Асноўнай групы Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы, мы абмеркавалі пытанні ўзаемадзеяння ў міжнародных структурах з улікам фактараў, якія могуць аказаць сур'ёзны ўплыў на перспектывы еўразійскай інтэграцыі.

Адзін з такіх фактараў — кітайская ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях». Беларусь — актыўны прыхільнік гэтага праекта. Увесну наступнага года ў Мінску пройдзе Міжнародная канферэнцыя Групы падтрымкі Шаўковага шляху ў ПА АБСЕ. І задача дэпутатаў — годна прэзентаваць магчымасці нашай краіны як найважнейшага сувязнага звяна на эканамічнай прасторы Еўразіі.

У гэтых мэтах трэба выкарыстоўваць і патэнцыял работы, якую трэба правесці ў міжпарламенцкіх арганізацыях, тым больш што ў найбліжэйшыя месяцы менавіта ў гэтую сферу перамесціцца цэнтр нашай актыўнасці. Мы прымем удзел у зімовым пасяджэнні ПА АБСЕ ў Вене, сесіях ПАСЕ ў Страсбуры. Акрамя таго, у красавіку ў Санкт-Пецярбургу пройдзе сорак дзявятае пленарнае пасяджэнне МПА СНД.

А ўжо заўтра ў Маскве пачне сваю работу пяцьдзясят пятая сесія Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. Галоўным адрозненнем гэтага форуму стане тое, што разам з традыцыйным разглядам Саюзнага бюджэту мы, як і дамаўляліся раней, упершыню правядзём так званую ўрадавую гадзіну. Гэтым разам дыскусія будзе прысвечана пытанням фарміравання адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы, адмены роўмінгу. Мяркую, што менавіта такія інтэрактыўныя формы павінны часцей выкарыстоўвацца саюзнымі парламентарыямі для абмеркавання найбольш вострых пытанняў беларуска-расійскай інтэграцыі.

На заканчэнне, паважаныя калегі, хацеў бы сказаць некалькі слоў пра работу ў выбарчых акругах. Наступны год будзе дастаткова няпросты ў тым сэнсе, што мы паступова ўступаем у перыяд важных выбарчых кампаній. Ужо сёння ў краіне назіраецца паступовае павышэнне палітычнай актыўнасці. Таму нам трэба сур'ёзна ўзмацніць інфармацыйны складнік сваёй работы з насельніцтвам, працоўнымі калектывамі, грамадскімі аб'яднаннямі.

Наша галоўная задача — кансалідацыя грамадства. Людзі павінны з першых рук атрымліваць дакладную і аб'ектыўную інфармацыю аб усіх дзеяннях улады, аб мерах, якія прымае дзяржава па правядзенні палітычнага курсу, накіраванага на захаванне суверэнітэту, мірнага і спакойнага развіцця краіны ў складаных знешнепалітычных і знешнеэканамічных умовах.

Ну а напярэдадні Новага года нам, зразумела, трэба прыняць самы актыўны ўдзел у рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці». Гэты дабрачынны марафон — выдатны прыклад таго, як добрыя справы здольныя аб'ядноўваць людзей самых розных узростаў, прафесій і перакананняў. Бо за апошнія гады колькасць неабыякавых грамадзян, якія набываюць для дзяцей цацкі, прадметы першай неабходнасці, пераводзяць грошы на рахункі дзіцячых устаноў, значна вырасла.

Дэпутаты заўсёды актыўна ўдзельнічаюць у гэтай акцыі, падключаюць да яе прадпрыемствы, грамадскасць. І нам трэба працягнуць гэтую добрую традыцыю — абавязкова наведаць інтэрнаты, дамы сямейнага тыпу, бальніцы, апякунскія і прыёмныя сем'і, аказаць дапамогу ў вырашэнні існуючых праблем і, вядома, падарыць дзецям свята.

## Актуальныя пытанні і іх рашэнні

**У гэтую суботу, 22 снежня, у аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме традыцыйна адбудуцца прамыя тэлефонныя лініі.**

**З 9.00 да 12.00 на сувязі з насельніцтвам будуць:**

першы намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама **Валерый Васілевіч Рабкавец** (80162213121);

старшыня ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама **Мікалай Мікалаевіч Шарснёў** (80212222222);

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама **Уладзімір Аляксандравіч Прывалаў** (80232331237);

старшыня ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама **Уладзімір Васілевіч Краўцоў** (80152735644);

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама **Віктар Уладзіміравіч Некрашэвіч** (80222501869);

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама **Сяргей Пятровіч Неўмяржыцкі** (80175004160);

старшыня МІНСКАГА гарвыканкама **Анатоль Аляксандравіч Сівак** (80172224444).

# 20 ХВІЛІН ЗАМЕСТ 15

## З новага года прыём ва ўрача агульнай практыкі падоўжыцца

**З 1 студзеня 2019 года павялічваецца час прыёму ва ўрачоў агульнай практыкі.**

Згодна з новымі нормамі, спецыялістам, якія абслугоўваюць дзіцячае і дарослае насельніцтва, на пярвічны прыём будзе адведзена 20 хвілін (раней было 15), на прафілактычны агляд у вылучаныя гадзіны ці дні (у паліклініцы ці на выездзе) — 15 хвілін (замест 10). Урачам агульнай практыкі, якія абслугоўваюць дарослае насельніцтва, на пярвічны прыём будзе адведзена 18 хвілін (раней 15), на прафілактычны прыём у вылучаныя дні ці гадзіны — 13 хвілін (раней — 10).

Як растлумачылі ў Міністэрстве аховы здароўя, змяненне нормаў часу для ўрачоў агульнай практыкі абумоўлена больш шырокім колам абавязкаў, а таксама больш глыбокім узроўнем ведаў і навыкаў у параўнанні з участковым тэрапеўтам.

Нагадаем, што ўрачы агульнай практыкі аказваюць дапамогу ў галіне тэрапіі, неўралогіі, отарыналарынгалогіі, афтальмалогіі, акушэрства і гінекалогіі, хірургіі, эндакрыналогіі і іншых галінах ва ўмовах гарадскога населенага пункта пры абслугоўванні дарослага насельніцтва. У сельскай мясцовасці — яшчэ і ў галіне педыятрыі пры абслугоўванні дарослых і дзяцей. Адначасова з увядзеннем у штатны расклад устаноў аховы здароўя пасад урачоў агульнай практыкі ўводзяцца і пасады членаў каманды урача агульнай практыкі — памочнік урача па амбулаторна-паліклінічнай дапамозе і медыцынскіх сясцёр агульнай практыкі.

**Алена КРАВЕЦ.**

Фінансы

## Інфляцыя налета чакаецца не больш за 5 %

**Пра гэта паведаміў учора старшыня праўлення Нацыянальнага банка краіны Павел КАЛАУР.**

«Нізкаінфляцыйнае асяроддзе і стабільнасць фінансавага сектара з'яўляюцца ключавымі ўмовамі для ўстойлівага эканамічнага росту, асновай для павышэння даверу да эканамічнай палітыкі, якая праводзіцца. Таму дзеянні Нацыянальнага банка будуць сфакусіраваныя на дасягненні двух мэт — падтрыманні цэнавай і фінансавай стабільнасці», — адзначыў кіраўнік Нацбанка.

Пры адсутнасці значных шокаў стаўка рэфінансавання на канец 2019 года ацэньваецца на ўзроўні 9—10 % гадавых, стаўкі па новых крэдытах банкаў у нацыянальнай валюце — 10,5—11,25 % гадавых. Да канца гэтага года працэнтныя стаўкі па новых рынкавых крэдытах у нацыянальнай валюце, паводле ацэнак Нацбанка, будуць каля 11 % гадавых. Гэта гістарычны мінімум, заўважыў кіраўнік галоўнага банка краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ДЗЕ СТРАЧВАЕ БЮДЖЭТ?

## КДК Гродзенскай вобласці выявіў зацягнутыя тэрміны праектных работ

**Гэта звязана з недасканалай распрацоўкай перадпраектнай дакументацыі. Дагаворы заказчыкаў з праектнымі арганізацыямі ў такіх выпадках заключаюцца без поўнага комплексу зыходных даных, што прыводзіць да карэктавання праекта і яго падаражання.**

Большасць аб'ектаў выяўлена ў горадзе Астравец, дзе зараз вядзецца актыўнае будаўніцтва ў сувязі з размяшчэннем тут будучай АЭС. Не заўсёды праекты паступаюць у канчатковым выглядзе, часам яны патрабуюць дапрацоўкі. Так, унясенне змяненняў у аб'ект забудовы мікрараёна № 2 у Астраўцы са школай на 765 вучняў зацягнула праектныя работы на паўгода, што прывяло да павелічэння першапачатковага кошту больш чым у пяць разоў, ці на 315 тысяч рублёў. Таксама на паўгода зацягнуліся праектныя работы па будаўніцтве ў тым жа Астраўцы раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі. Адпаведна і кошт праекта вырас на 20 тысяч рублёў. На 72 тысячы рублёў павялічыўся кошт праектных і пошукавых работ на адным з аб'ектаў сацыяльна-культурнага прызначэння.

Не ўкладваюцца ў тэрміны праектных работ на аб'екце будаўніцтва сярэдняй школы з басейнам у мікрараёне Паўднёвы горада Гродна. У выніку — патрэбны дадатковыя датацыі з бюджэту больш чым на 7 тысяч рублёў.

З мэтай аптымізацыі расходаў спецыялістамі КДК накіраваны прапановы заказчыкам, падрадчыкам і праекціроўшчыкам па прымяненні сучасных тэхналогій і інжынерных рашэнняў. У выніку такіх рэкамендацый за 2018 год удалося сэканоміць больш за 12 млн рублёў, якія накіраваны на іншыя праблемныя пытанні.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Надвор'е

# НА КАЛЯДЫ ГЛЯДЗІМ — УСЮ ЗІМУ БАЧЫМ

**25 снежня, згодна з народным прагнозам надвор'я, — самы халодны дзень зімы. Калі сонейка на Спірыдона — дні на праваслаўныя Каляды (7—19 студзеня) будуць ясныя, а Новы год — марозны, а калі хмурна і на дрэвах іней — быць ночы на Новы год цёплай і пахмурнай. Калі ноч ясная, зіма будзе халодная, а лета гарачае; калі ноч цёмная — зіме быць цёплай, а лету — пахмурным.**



### ПРАДБАЧЫЦЬ БУДУЧЫНЮ

Якой жа будзе зіма ў 2019 годзе? Звернемся да народных прыкмет.

Напрыклад, дубы ўмеюць прадказваць надвор'е з дапамогай сваіх пладоў — жалудоў. Чым таўсцейшая шкарлупіна ў жалудоў, тым суровейшая будзе зіма. Падобным чынам перад халоднай зімой ліставая абгортка кукурузы і шалупіна ў цыбулі таксама становяцца больш тоўстымі і цвёрдымі.

Нашымі продкамі заўважана, што, калі пчолы, восы і чмялі пачынаюць будаваць гнёзды вельмі высока на дрэвах, варта чакаць халоднай зімы з высокімі гурбамі. Гэтыя насякомыя ўпадаюць у спячку, таму ім важна ведаць, што падчас зімоўкі іх нішто не патрывожыць.

Хвоі даюць больш буйныя шышкі, чым звычайна, калі зіма абяцае быць асабліва суровай. Гэта звязана з тым, што чым больш дрэва дасць насення, тым больш шанцаў, што некаторыя з іх прарастуць увясні.

І яшчэ. Фальклор кажа, што чым ярчэйшая лістота ўвосень, тым больш халодней і снежнай абяцае быць зіма. Сёлета мы любаваліся раскошай восеньскіх фарбаў. Значыць, трэба ўцяпляцца!

### ДАКЛАДНЫ ПРАГНОЗ НА ПЯЦЬ ДЗЁН

Працяглыя ападкі і галалёдзіца чакаюцца ў нашай краіне ў наступныя выхадныя, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Надвор'е ў цяперашнім снежні не адрозніваецца стабільнасцю, і маразы чаргуюцца з адлігай.

У суботу надвор'е будзе вызначаць цыклон, які пачне перамяшчацца праз тэрыторыю Беларусі. Чакаюцца працяглыя ападкі (снег, мокры снег, па паўднёвым захадзе краіны — з дажджом). Месцамі прагназуецца туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў да 1 цяпла, удзень — ад 3 марозу да плюс 3 градусаў, па захадзе Брэсцкай вобласці яна можа павысіцца да 5 цяпла. На наступны дзень, у нядзелю, мы застанёмся пад уплывам цыклону, цэнтр якога перамесціцца на тэрыторыю Расіі. На большай частцы тэрыторыі краіны чакаецца снег, мокры снег, уначы па паўднёвым усходзе — з дажджом. Месцамі будзе слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 4 да плюс 2 градусаў.

У панядзелак у тылавой частцы цыклону на нашу краіну пачне паступаць больш халоднае паветра. Уначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі днём пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да мінус 2—9 градусаў, удзень будзе 1—7 марозу.

25 снежня надвор'е будзе вызначаць вобласць паніжанага атмасфернага ціску. Месцамі па краіне пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог прагназуецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—10 марозу, пры праясненнях месцамі паветра астудзіцца да мінус 12 градусаў, тэмпература ўдзень будзе ад нуля да мінус 7 градусаў, па паўночным усходзе краіны — не вышэй за 9 марозу.

### А МІЖ ТЫМ...

Самая высокая дзённая тэмпература ў снежні мінулага года склала плюс 4 градусы. У той час як мінімальная тэмпература ноччу апускалася да мінус 7 градусаў.

Большую частку снежня ў Мінску назіраюцца пахмурныя дні, аднак сонечныя і хмарныя дні таксама не рэдкасць. Колькасць ападкаў, якія выпадаюць у горадзе на працягу снежня, складае 38,8 мм. Такім чынам снежань з'яўляецца адным з самых сухіх месяцаў у годзе.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Гучная справа

# За службовую халатнасць

## Вынесены прысуд былому галоўнаму архітэктару Магілёва

**Былы чыноўнік абвінавачваўся ў халатных адносінах да сваёй справы. Нагадаем, што 1 лістапада мінулага года на дзяцей 10 і 9 гадоў, якія гулялі ў закінутым доме па вуліцы Загарадная шаша ў Магілёве, абрынулася пліта перакрыцця. Адзін з хлопчыкаў загінуў на месцы, другі памёр у рэанімацыі праз некалькі дзён пасля трагедыі. Першапачатковае абвінавачанне было прад'яўлена 43-гадоваму мужчыну, які будаваў гэты дом самавольна. Але злачынства ў яго дзеяннях знойдзена не было. І тады пад следства трапіў былы галоўны архітэктар Магілёва. Лічыцца, што ён ведаў пра небяспечны недабуд, але не пракантраляваў яго знос.**

Падсудны прызнаны вінаватым у неналежным і нядобрасумленным выкананні сваіх службовых абавязкаў, што пацягнула за сабой смерць людзей. Суд Ленінскага раёна Магілёва прызначыў яму пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін 2,5 года з адбываннем у папраўчай калоніі ва ўмовах пасялення і пазбавіў права займаць дзяржпасады, звязаныя з арганізацыйна-распарадчымі абавязкамі і выкананнем юрыдычна значных дзеянняў на тэрмін 5 гадоў. Сем'ям, якія пазбавіліся дзяцей, Магілёўскі гарвыканкам павінен выплаціць па 40 тысяч рублёў кожнай за маральную страту.

**Начальнік аддзела пракуратуры Магілёўскай вобласці Сяргей МІНАЎ** адзначыў, што суд цалкам пагадзіўся з дзяржаўным абвінавачаннем:

— Былы чыноўнік Магілёўскага гарвыканкама абвінавачваўся па артыкуле 428 Крымінальнага кодэкса. І нашы доказы яго віны суд прызнаў справядлівымі. Адбываць пакаранне абвінавачаны будзе ва ўмовах пасялення, паколькі злачынства зроблена па неасцярожнасці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**




## НУ, САПРАЎДНЫ МАЧА!..

Статыстыка ведае ўсё. А мы, людзі, дык хіба здагадваемся, як шмат цяпер так званых неперспектыўных вёсак. У нейкіх, на жаль, па некалькі хат, па некалькі жыхароў. Але ж яны па-ранейшаму жывуць, трымаюць жыўнасць, дапамагаюць адно аднаму...

У тую вясну суседзі Рыгор з Сямёнам сабраліся памежны плот перабраць і ўсё падрыхтавалі: засталося хіба ў горад з'ездзіць — дакупіць цвікоў.

Гэта ў іх была пакупка пад нумарам адзін. Пад нумарам два — неспадзеўкі з'явілася. На Рыгоравым двары каршун пеўня забіў. У іншы год куры і без яго абышліся б, а ў той — Рыгорыха ўдумала квактуху пасадзіць, завесці шэрых курачак. Дык не ехаць жа з дому ім абодвум, не аддаваць лішніх грошай за дарогу, не марнаваць час. Тым больш што Рыгор — гаспадар, а не пустадомак нейкі...

Карацей, сабрала яго жонка ў дарогу і выдала на пакупкі дзясятку.

— Малавата будзе, — прызнаў Рыгор.

— Ага... Табе на выпіўку не хопіць, — «прачытала» яго думкі кабета.

Муж пакрыўдзіўся, ляпнуў дзвярыма і пайшоў да Сямёна.

У горад яны паехалі ўдвух. Як і варта было чакаць, спачатку скінуліся і купілі тое, што хацелі самі: гэта значыць, цвікі. Засталося наведаць рынак.

Людзей там, можна сказаць, не было. Але ж адзін і вельмі сур'ёзны дзяцюк з машыны прадаваў курэй. Там жа былі і пеўні — вялікія, прыгожыя.

— Легорн... Пародзістыя, — пахваліўся гаспадар. — Дванаццаць рублёў прашу.

Па традыцыі ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў акцыі — дзеці-інваліды, малыя з шматдзетных, прыёмных сем'яў, дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, адораныя школьнікі ды іншыя.

Дарэчы, адными з першых, хто накіраваўся з віншаваннямі і пачастункамі, сталі дэпутаты гарадскога Савета 28-га склікання. Алена Берараснева, Сяргей Мазайла, Дзяніс Сырамаха і Ігар Чывель 13 снежня завіталі ў госці ў дзіцячы дом сямейнага тыпу, што знаходзіцца на вуліцы Ваўковіча ў абласным цэнтры. Менавіта тут атрымалі прапіску не адзін, а адразу тры такія дзіцячыя дамы, пасля чаго вуліца ў народзе набыла своеасаблівы статус «бацькоўскай». Напрыклад, сужэнцы Наталля і Андрэй Мушынскія сталі бацькамі для пяці хлопчыкаў і пяці дзяўчатак ад трох да 14 гадоў. Малыя з удзячнасцю сустракалі дэпутацкі «дэсант», расказвалі аб сваіх поспехах, цікавых момантах з жыцця ў новым доме і частавалі гасцей гарбатай.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**



ПРЫЕМНАЯ НАВІНА

# МАЛЕНЬКІЯ ЗОРКІ Ў «КОСМАСЕ»

**У вёсцы Копішча Бараўлянскага сельсавета адкрыўся новы дзіцячы сад № 3 на 150 месцаў.**

Забудоўшчыкі назвалі садок «Космас». І гэтая назва цалкам адпавядае сутнасці, унутранаму і знешняму афармленню. Фасад будынка нагадвае фюзеляж і ў цёмны час сутак пераліваецца ўсімі колерамі. Каля ўвахода ўстаноўлена ракета, у памяшканні абсталяваны скаладром і зорнае неба на стале. Візітнай карткай установы стала мадэль Сонечнай сістэмы, упрыгожаная аўтографамі і пажаданнямі касманаўтаў. А восем груп, створаных тут, атрымаюць назвы планет. На вуліцы маецца гульнявая пляцоўка з усімі неабходнымі прыстасаваннямі: арэлямі, горкамі-самалётамі, горкамі-ракетамі. Побач — добраўпарадкаваная зялёная зона.

Падчас урачыстага адкрыцця **начальнік галоўнага ўпраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Таццяна АПРАНІЧ** падкрэсліла значнасць гэтай падзеі не толькі для Мінскага раёна, але і ў цэлым для сталічнай вобласці. «Сумеснымі намаганнямі мы зрабілі такі падарунак дзецям. Кожнае дзіця для нас — зорка, і мы робім усё для таго, каб нашы зоркі свяціл ярчэй!» — падкрэсліла яна.

Ва ўстанове ёсць таксама музычная, спартыўная залы, афармленыя ў касмічнай тэматыцы. Неардынарнасць дызайну адзначалі і бацькі малых. На іх думку, незвычайнае афармленне не толькі нясе сэнсавую нагрузку, але і паўплывае на эстэтычнае развіццё дзяцей. І хто ведае, магчыма, хтосьці з іх у будучыні звяжа сваё жыццё з касмічнымі тэхналогіямі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

**Жанна ВАРАБЕЙ, старшыня Бараўлянскага сельвыканкама:**

— Сімвалічна, што адкрыццё дзіцячага садка супала з пачаткам рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці» і дазволіла часткова вырашыць праблему з месцамі ў дашкольных установах.

Акрамя гэтай дашкольнай установы ў мікрараёне Новая Баравая ўведзены ў дзеянне яшчэ два дзіцячых сады — у 2017 і 2018 гадах. Усе яны з'явіліся ў выніку прыватна-дзяржаўнага партнёрства. Іх пабудавала група кампаній «А-100 «Дэвелапмент» і перадала на баланс упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама. У Новай Баравой пачалося таксама будаўніцтва школы на 1020 месцаў. Плануецца ўвесці яе ў эксплуатацыю ў 2020 годзе. У Бараўлянах на вуліцы Жамчужнай запланавана ўзвядзенне вучэбна-педагагічнага комплексу «Дзіцячы сад-сярэдняя школа» адпаведна на 240 і 1020 месцаў. Тут жа на вуліцы 40 год Перамогі пачалося будаўніцтва дашкольнай установы на 230 месцаў. Плануецца яе здаць у 2019-м.

ВОПЫТ

# ПАДЫХОД ПА-ГАСПАДАРСКУ

## *Як далучыць мясцовых жыхароў да агульных добрых спраў, ведаюць актывісты на месцах*

**Вопытам у вырашэнні пытанняў, якія датычацца паляпшэння якасці жыцця людзей, з «МС» падзяліліся старшыні райсаветаў дэпутатаў, камітэтаў тэрытарыяльнага самакіравання і сельскія старасты.**

**Анжаліка ГОМАН, старшыня Краснапольскага райсавета дэпутатаў:**

*— Разумеючы, што партнёрства ўлады і грамадскасці — фундамент паспяховага вырашэння мясцовых праблем, Краснапольскі раённы Савет дэпутатаў далучыўся да Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў і аказвае метадычную дапамогу пяці сельскім Саветам дэпутатаў, а таксама забяспечвае каардынацыю дзейнасці 64 органаў ТГС на тэрыторыі раёна.*

*Як мясцовыя жыхары ўключаюцца ў працэсы мясцовага развіцця? Гэта відаць па выніках. Калі ў 2015—2016 гадах члены ініцыятыўных груп прапанавалі 15 ідэй для мясцовага развіцця, то ў 2017—2018 гадах рэалізуюцца 17 праектаў на суму больш чым 250 тысяч еўра. Напрыклад, мы ствараем уласныя механізмы зялёных рэінвестыцый. Заклалі гадавальнік пладова-ягадных культур і фруктовы сад на 3000 саджанцаў пры дзвюх сельскіх школах, 30 шматдзетных сем'яў заклалі свае сады, адкрыты мясцовы цэнтр сельскага маркетынгу.*

*Мы стварылі дзве бізнес-супольнасці па 15 чалавек у аграгарадках Янаўка і Горы, заклалі эксперыментальныя ўчасткі, пабудавалі цяпліцы і правялі навучальныя заняткі. Дзякуючы гэтаму людзі маюць магчымасць вырошчваць экалагічна чыстую прадукцыю, выкарыстоўваючы сучасныя тэхналогіі, і дзяліцца вопытам з суседзямі.*

*З дапамогай праекта Еўрапейскага саюза «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні» ў раёне рэалізавалі некалькі мясцовых ініцыятыў: фестываль «Тэатральныя вечарыны», «Крок да самастойнасці», «Развіццё ганчарнага майстэрства для пазнавальнасці раёна», «Янаўка — хакейная сталіца Краснапольшчыны».*

*Вынікам удзелу некалькіх раёнаў — членаў Магілёўскай абласной асацыяцыі ў праектнай дзейнасці стала стварэнне Рэгіянальнага савета падтрымкі мясцовых ініцыятыў у сферы ўстойлівага развіцця. У 2017 годзе пяць райсаветаў дэпутатаў (Быхаўскага, Клічаўскага, Краснапольскага, Слаўгарадскага, Чэрыкаўскага раёнаў) вырашылі аб'яднаць намаганні і распрацавалі план узаемадзеяння па павышэнні ўстойлівага развіцця раёнаў на 2018—2020 гады і на перыяд да 2030 года. Галоўнымі напрамкамі супрацоўніцтва сталі тэмы, якія забяспечваюць падтрымку навакольнага асяроддзя, крэатыўная эканоміка, занятасць і самазанятасць, павышэнне патэнцыялу мясцовых рэсурсных цэнтраў адукацыі дарослых.*

**Ала ПАСТУХОВА, старшыня мікразоны «Камсамольская» (г. Крычаў):**

*— Наша мікразона — адна з самых густанаселеных, тут жывуць больш за пяць тысяч чалавек. Традыцыйнымі сталі конкурсы «Упрыгожыць зямлю кветкамі», «Найлепшы пад'езд». Па ініцыятыве жыхароў ладзяцца суботнікі, каб навесці парадак, добраўпарадкаваць і азеляніць двары.*

*У мікразоне створаны выдатныя ўмовы для адпачынку, гульнявыя пляцоўкі для дзяцей з мноствам разнастайных лабірынтаў. Мы правялі акцыю «Арт-лаўкі — казачная лавачка горада», якую ініцыявалі жыхары мікразоны, выкладчыкі школы мастацтваў. Дзеці малявалі на асфальце, а выкладчыкі пераносілі іх малюнкі на лаўкі. Атрымалася прыгожа, святочна і казачна.*

*Па жаданні жыхароў мікрараёна і для стварэння новых сацыяльных сувязяў працуюць клубы па інтарэсах, дзе жыхары могуць рэалізаваць сябе ў розных напрамках. Па ініцыятыве індывідуальных прадпрымальнікаў горада ў мікразоне ўсталявалі вулічныя трэнажоры. Актыўныя члены Савета мікразоны арганізавалі групу «Здароўе» сярод насельніцтва мікрараёна з наведваннем фізкультурна-аздараўленчага комплексу «Сож», плавальнага басейна.*

*У рамках рэспубліканскага конкурсу «Энергамарафон» распрацавалі праект «Сістэма адукацыйнага працэсу і інфармацыйна-прапагандысцкай работы ў сферы энергазберажэння ва ўстанове адукацыі», ініцыятарам якога стала жыхарка нашага мікрараёна, намеснік дырэктара школы. Так, каля школы з'явіліся сонечныя батарэі, здольныя асвятляць прылеглую тэрыторыю. А ў месцах агульнага карыстання ўстаноўлены лямпы з датчыкамі руху.*

*Партнёрамі шэрагу праектаў, распрацаваных у рамках Года малой радзімы, сталі самі жыхары мікрараёна. З 2018 года рэалізуецца праект «Палацава-паркавы ансамбль — тэрыторыя экатурызму і чыстай экалогіі», які стаў адным з пераможцаў конкурсу Праграмы малых грантаў Глабальнага экалагічнага фонду. Быў распрацаваны праект «Палац Пацёмкіна — паўднёва-ўсходні экацэнтр па прапагандзе, асвеце і выхаванні».*

*Я з упэўненасцю магу сказаць, што будучыня нашага горада ў руках неабыякавых, дзейных людзей, якія ўмеюць не толькі паказаць прыклад руплівага і гаспадарнага стаўлення, але і зацікавіць сваіх суседзяў у добрых і карысных справах.*

# З УЛІКАМ

## *Што неабходна для далейшага развіцця мясцовага самакіравання ў Беларусі і стварэння асацыяцый мясцовых Саветаў дэпутатаў?*

**Аб гэтым ішла грунтоўная размова ў Савеце Рэспублікі, дзе на мінулым тыдні прайшоў тэматычны семінар з удзелам еўрапейскіх экспертаў. Усе прысутныя змаглі азнаёміцца з перадавым вопытам зараджэння і развіцця нацыянальных асацыяцый у шэрагу краін Еўропы, існуючымі мадэлямі рэгіянальных інстытуцый у Беларусі і прыкладамі вырашэння пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва ў рамках рэалізацыі мясцовых ініцыятыў.**

У сённяшняй тэме нумара мы падрабязна раскажам аб усім, што выклікала цікавасць ва ўдзельнікаў семінара, а таксама пазнаёмім з удалымі прыкладамі работы органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання на месцах.

Мадэратарам выступаў **старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Аляксандр ПАПКОЎ**, які адзначыў, што ў пэўнай ступені семінар дапаможа вырашыць цэлы шэраг пытанняў у кірунках арганізацыі мясцовага самакіравання.

— У адпаведнасці з Канстытуцыяй і законам «Аб мясцовым самакіраванні», пытанні жыццезабеспячэння на месцах ускладзены на мясцовыя ўлады. Мясцовыя Саветы дэпутатаў разглядаюць план сацыяльна-эканамічнага развіцця на пэўны перыяд, фарміруюць бюджэт, кантралююць выкананне гэтых дакументаў, і, натуральна, яны лепей ведаюць, што трэба рабіць на месцах, каб пытанні, якія хвалююць людзей, былі вырашаны, — адзначыў ён і звярнуў увагу на існуючую практыку работы, калі прыняццэ дакументаў мясцовага значэння чакаюць ад цэнтральных уладаў. Маўляў, пасля гэтага пытанні самі па сабе здымуцца. Так не бывае, упэўнены Аляксандр Папкоў, таму нацэліў прысутных на аснове вопыту, назапашанага ў Беларусі, краінах постсавецкага блока, дзяржавах, якія ўваходзяць у Еўрапейскі саюз, пачынаць дасканала вывучаць тэму. У тым ліку і на тэму стварэння Асацыяцый мясцовых Саветаў дэпутатаў.

— Мы хочам паглядзець на практыку іншых краін у гэтым кірунку, пасля чаго падрыхтуем своеасаблівую дарожную карту, па якой і будзем працаваць з улікам нацыянальных інтарэсаў, — адзначыў ён.

### Мясцовы бюджэт ці інтарэсы завода?

Пра тое, як уладкавана цяперашняе самакіраванне ў Еўропе, аб сітуацыі і тэндэнцыях расказалі эксперты з ЕС.

У прыватнасці, **дырэктар Дэпартамента па дэмакратычным кіраванні Савета Еўропы Дэніэль ПАПЕСКУ** адзначыў, што дэмакратыя на месцах — гэта еўрапейская каштоўнасць.

— Даследаванні паказваюць, што дэцэнтралізацыя — гэта адзін са спосабаў эканамічнага росту для рэгіёнаў. Еўропа ў асноўным прайшла праз дэцэнтралізацыю параўнальна нядаўна — прыкладна паўстагоддзя таму. Ды і сам па сабе гэта працэс няхуткі, ён расцягваецца нават не на дзесяць гадоў, бо ўключае не толькі перадачу кампетэнцый, але і нагляд за выкананнем заканадаўства.

Спікер адзначыў чатыры тыпы рэформаў, праз якія прайшлі краіны Еўропы на шляху да цяперашняга мясцовага самакіравання. Першая з іх — адміністрацыйна-тэрытарыяльная. Напрыклад, у Францыі і Італіі змяняліся межы і колькасць рэгіёнаў і, адпаведна, органаў улады. Другая рэформа датычыцца мясцовага фінансавання. Пасля крызісу 2008 года яна перагледалася, паколькі нават у багатай Нарвегіі некаторыя муніцыпалітэты збанкрутавалі. Але пасля пачаўся эканамічны рост. Трэцяя закранае эфектыўнасць мясцовых органаў улады і ўзнімае на грэбень хвалі кадравыя пытанні. А чацвёртая з іх — абагульняльная, азначае стварэнне Асацыяцыі органаў мясцовага самакіравання. Гэта дабравольныя недзяржаўныя аб'яднанні, якія валодаюць правамі юрыдычнай асобы і вядуць перагаворы з парламентам і ўрадам па пытаннях, якія непасрэдна закранаюць інтарэсы рэгіёнаў.

Магутныя асацыяцыі створаны на Балканах. **Намеснік кіраўніка дэлегацыі Сербіі ў Кангрэсе мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы Саша ПАУНАВІЧ** расказаў на ўласным прыкладзе, наколькі гэта спрыяльна для мясцовых бюджэтаў.

— У горадзе, дзе я быў мэрам, працуе вельмі буйны цэментны завод. Ён плаціў падаткі ў наступнай прапорцыі: 80 % пералічвалася ў мясцовы бюджэт, рэшта ішла ў агульнадзяржаўны. Кіраўніцтва завода па сваіх меркаваннях пралабіравала змяненне падатковых адлічэнняў. Атрымлівалася б так, што ў мясцовы бюджэт паступала б на 90 % падаткаў меней, чым раней. Мы з гэтым былі нязгодныя і змагаліся дзесяць гадоў на самых высокіх узроўнях. Пасля гарачых дыскусій было прынята рашэнне пакінуць статус-кво.

### Як працуе сістэма народнага кантролю?

Дацкім досведам падзяліўся **дырэктар Асацыяцыі органаў мясцовага самакіравання гэтай краіны Холгер ПІНТХ**. Невялікая краіна, заціснутая паміж Балтыйскім і Паўночным марамі, вядзе адлік гэтай практыкі яшчэ з 60-х гадоў ХІХ стагоддзя:

— У Даніі 50 % падаткаў ідзе ў бюджэты муніцыпалітэтаў. І гэта павялічвае адказнасць перад мясцовымі жыхарамі, паколькі ўлады пералічваюць грошы ў якасці падаткаў і цалкам законна патрабуюць, каб за гэтыя грошы было створана асяроддзе з ад-



Тэлесеткі

# НОВЫ ГОД ПАД КЛАСІКУ

**Сустрэць свята ў суправаджэнні не проста добрай, а правераней часам і пакаленнямі слухачоў музыкі прапануе гледачам сацыякультурны канал «Беларусь 3». Святочная канцэртная праграма, якая выйдзе ў эфір у двух аддзяленнях 31 снежня і 1 студзеня, так і называецца — «Новы год у класічным стылі».**

Сімфанічны аркестр Белтэлерадыёкампаніі пад кіраўніцтвам Аляксандра Сасноўскага сабраў у адной студыі цэлае сузор'е вядомых беларускіх артыстаў оперы і аперэты. Так, разам з аркестрам і хорам выступілі салісты Вялікага тэатра Беларусі, заслужаныя артысты краіны Аксана Волкава, Алена Сало і Алена Шведава, народны артыст Беларусі Уладзімір Пятроў, артысты музычнага тэатра Мікалай Русецкі і Наталля Дзяменцьева, артысты тэатра «Тэрыторыя мюзікла», джазавы калектыў Jazzology, а таксама фіналісты сёлетняга чэмпіянату Беларусі па спартыўных бальных танцах Ангеліна Міхайлава і Віталь Вайцяшонак.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**






## ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 78

У канцы лістапада 2018 года адбыўся чэмпіянат Мінска па шашках-64.

Перамог кандыдат у майстры Захар Шыбакоў — 16 ачкоў з 18 магчымых, на другім і трэцім месцах кандыдаты ў майстры Анатоль Шушкевіч — 14 ачкоў, і Мікалай Ляшкевіч — 12 ачкоў. Найлепшай у жаночым заліку стала Вікторыя Нікалаева — 14 ачкоў (2-е месца ў агульным заліку).

Паглядзіце цікавы фрагмент гульні.

№ 86 М. Ляшкевіч — М. Наўроцкая

**Белыя простыя шашкі:** b2, e3, d4, g7 (4).

**Чорныя простыя шашкі:** h2, b6, d6 (3).

Белыя згулялі 1. gf8 (пасля 1 ... bc5 2. db6 hg2 партыя скончылася нічыйным вынікам)

лепшы працяг.

1 ef4 hg1 (1...dc5 2.de5 cb4 3.gf8 ba3 4fh8+) 2 gf8 gc5

3 bc3 ba5 4 fe5 df4 5 fa3+

З 1 па 9 снежня 2018 года ў горадзе Санкт-Пецярбургу (Расія) адбыўся традыцыйны адкрыты турнір па шашках-64 памяці легендарнага ленінградскага шашыста Васіля Сокава. Беларускі гросмайстар Яўген Кандрачэнка стаў пераможцам бліскавічнай праграмы.

У пачатку снежня пайшоў з жыцця шматгадовы вядучы шашачнага аддзела газеты «Звязда», майстар спорту СССР па шашачнай кампазіцыі, міжнародны арбітр па шашачнай кампазіцыі, пераможца 1-га чэмпіянату БССР 1976 года па шашачнай кампазіцыі ў жанры праблемы-64 Мікалай Мікалаевіч Грушэўскі (16.05.1940 — 03.12.2018).

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі М. Грушэўскага.

№ 87



**Белыя простыя шашкі:** e7, f4, g3, g5 (4).

**Чорныя простыя шашкі:** b2, b4, d2, e3, f6, h2 (6).

№ 88

**Белыя простыя шашкі:** a7, d6, e7, g3, g5 (5).

**Чорныя простыя шашкі:** a5, b2, b8, d2, d4, f6 (6).

№ 89

**Белыя простыя шашкі:** a7, f4, f6, g3, g5, h6 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** a5, b2, c7, d2, d4, e3, h8 (7).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Анонс: адкрыты турнір па шашках-64 памяці В. І. Перавалава адбудзецца 5 і 6 студзеня 2019 г. на базе ФОЦ г. Барысава (вул. Чапаева), 11.00 (15 мін. на партыю). Заяўкі па тэл. +37529 963 62 54 Фядотаву Ігару Іванавічу. E-mail: — uchkuduk54@mail.ru

Праверце свае рашэнні: выпуск № 77 ад 23.11.18.

№ 82 I g3.a7.c5 (b2) c3.c7 +

Нельга вырашыць хадамі, як у пазіцыі № 79 у П. і В. Шульгі:

I b8? (II g3 !!!) ... з некалькімі цікавымі нічыйнымі варыянтамі.

Але рашэнне, як у № 79, праходзіць у ОЛС:

II (b2?) C7.e5.c3.g3.a7 (e5) b8 (d4) f4 (c3) c1 +

№ 83 D8,c5,hxf6!,dxf6+

№ 84 2117, 7, 39, 1, 35(13, 13) 43+

№ 85 21,3 (24x44) 50+

Правільныя адказы даслалі В. Дударэвіч (в. Новая Мыш Баранавіцкага р-на), Ф. Карпей (Мядзел), У. Статкевіч (п. Зялёны бор, Івацэвіцкі р-н), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі, А. Ліцьвінаў (усе Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі р-н), В. Бандарык (Мінскі р-н).

Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, газета «Звязда»;

e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**





# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ




Сядзі і глядзі

## Казкі на Каляды



### «Дванаццаць калядных жаданняў» АНТ, 24 снежня

Напярэдадні чарговага каляднага свята Лора Ліндсі разумее, што жыццё яе распадаецца на часткі, і ў роспачы звяртаецца да псіхолага Ноэль з просьбай аб дапамозе. Але ў адказ атрымлівае толькі дзіўную параду: вярнуцца дадому і пачаць... загадваць жаданні. З пэўнай доляй скепсісу Лора так і робіць — і, на дзіва, жаданні пачынаюць спраўджвацца адно за адным, праўда, чамусьці гэта прыносіць больш шкоды, чым карысці. Трэба тэрмінова вярнуць усё на свае месцы, і тут, відаць, дапаможа толькі сапраўдны калядны цуд.

### «Тры песні для Папялушкі» «Беларусь 1», 25—27 снежня



Аня выхоўвалася ў прыёмнай сям'і, але заўжды хацела даведацца пра сваіх сапраўдных бацькоў. Перад выпускным балем дзяўчына дазнаецца, што хтосьці рэгулярна адпраўляў на яе імя грашовыя пераводы — і ў пошуках адказаў на свае пытанні едзе ў Маскву, каб знайсці таямнічага мецэната. У сталіцы яна збіраецца таксама паступіць у ВНУ, але спазняецца на экзамены — затое выпадкова трапляе на кастынг у музычны тэатр і атрымлівае ролю Папялушкі. Зрэшты, паступова высвятляецца, што апошняе зусім не выпадкова, бо маці Ані некалі пачынала акцёрскую кар'еру якраз у гэтым тэатры...



### «Суджаны-ражаны» «МІР», 29 снежня

Некалі Вользе наваражылі, што сваё каханне яна сустрэне пад Новы год. Аднак у Эдзіку, які з'явіўся на парозе яе дома ў адну навагоднюю ноч, жанчына расчаравалася: абяцаны прынц аказаўся банальным і даволі нецікавым кавалерам, і рашуча змяніла ўвесь лад жыцця: знешні вобраз і стыль, работу, кватэру. А пакуль яна пазбаўлялася непрыемных успамінаў, анёлыахоўнікі рэжысіравалі новую сустрэчу. І вось у чарговы навагодні вечар да Вольгі прыходзіць нечаканы, але вельмі настойлівы госць з далёкай Поўначы. З гэтага моманту навагоднія святы ператвараюцца ў чараду прыгод, а варажба не мае ніякіх шанцаў не збыцца.

## Не носяць друз у каламянцы

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**пошчак** — пералівісты гук;

**дру́з** — маса з бітага каменя;

**каламя́нка** — моцная льняная тканіна;

**зага́на** — недахоп, які выклікае асуджэнне;

**трызні́ць** — гаварыць у хворым стане, галюцыніраваць;

**лі́пець** — ледзь-ледзь трымацца;

**як слова сказаць** — вельмі хутка нешта зрабіць (беларусы яшчэ скажуць: *як стой, як вокам згледзець, як бач*; рускія: *в мгновение ока*);

**адны слёзы** — 1) вельмі дрэнны, мізэрны; 2) вельмі мала (беларускія адпаведнікі: *глядзець няма на што, нікуды не варты*; рускі: *ни в какие ворота*).

**Паўторы выпускаў тэлевіктарыны — у ранішнім эфіры «Беларусь 3» кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Удалы шопінг са «Звяздой»

**Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на І квартал або І паўгоддзе 2019 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе да 8 студзеня 2019 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.**

**Сярод падпісчыкаў 10.01.2019 года будуць разыграны 7 падарункавых сертыфікатаў універмага «Беларусь» на 100 рублёў і суперпрыз — падарункавы сертыфікат універмага «Беларусь» на 300 рублёў. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 20.01.2019 г.**

**Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 19.02.2019 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на І квартал або І паўгоддзе 2019 г. і пашпарта. Пасля 19 лютага выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Удалы шопінг са «Звяздой» чытайце ў 235-м нумары газеты «Звязда» ад 06.12.2018 г.**

**Тэлефон для даведак: 8 (017) 263 66 73.**

**Тэрмін правядзення гульні — з 07.12.2018 па 19.02.2019 г.**




**Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3440 ад 04.12.2018 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.**

### Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на І квартал або І паўгоддзе 2019 года

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска афармлена і аплачана ў** ____________________
(аддзяленне сувязі)

на І квартал або І паўгоддзе 2019 года

**Хатні адрас і тэлефон** (абавязкова) ______ (індэкс)

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

## Беларусь 1

**6.05 Серыял «Сваты» (12+).**
**7.20, 10.20 Меладрама «Шанц на каханне» (12+).**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Галоўны эфір».
**12.10, 15.10 Меладрама «Двайное жыццё» (16+).**
**21.00** «Панарама».
**21.45** Святочнае набажэнства на Раство Хрыстова. Прамая трансляцыя.
**23.45** Калядная служба з Ватыкана з удзелам Папы Францыска. Прамая трансляцыя.
**0.45 Камедыя «Ёлкі-5» (6+).**
**2.15** «Арэна».

## Беларусь 2

**6.55** М/с «Усё пра Розі» (0+).
**7.10 Фільм для дзяцей «Залатавалоска» (6+).**
**8.40, 18.35** «Тэлебарометр».
**8.45** Анімацыйны фільм «Тры волаты на далёкіх берагах» (0+).
**10.00** Анімацыйны фільм «Тры волаты. Ход канём» (6+).
**11.15** Анімацыйны фільм «Тры волаты і марскі цар» (6+).
**12.35** Анімацыйны фільм «Тры волаты і прынцэса Егіпта» (6+).
**13.50** «Капейка ў капейку» (12+).
**14.30 Серыял «Сямейныя гісторыі» (16+).**
**15.10** «Вяселле ўсляпую» (16+).
**16.50** Анімацыйны фільм «Калядная гісторыя» (12+).
**19.15** «Суперлато».
**20.05 Фэнтэзі «Вялікі і добры волат» (12+).**
**22.05** КЕНО.
**22.10 Камедыя «Перажыць Раство» (12+).**
**23.40** «Хадзі сюды і танцуй».
**23.45** «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).

## Беларусь 3

**7.00** «Прыгоды Бураціна». Фільм — дзецям. 1-я серыя (6+).
**8.05, 12.40, 19.50** Навіны культуры.
**8.25, 20.10** «Гэты дзень».
**8.30 «Пяшчотная зіма». Маст. фільм. 1-я і 2-я серыі (12+).**
**10.25** «Беларуская кухня». Бедная куцця. Чачоха.
**10.50** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+).
**11.15** «Спявае Беларусь».
**12.10** «Жывая культура». Тэхналогія выrабу шчэпавай птушкі-абярэга (Бярозаўскі раён, Брэсцкая вобласць).
**13.00** М/ф (0+).
**13.20 «Тры талеры». Фільм — дзецям (6+).**
**16.55** І. Штраус. «Казкі Венскага лесу». Спектакль Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра.
**18.25 «Зігзаг удачы». Камедыя (12+).**
**20.15** Да 220-годдзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча. «Адам. Жыццё чалавека». Дак. фільм. Фільм першы.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Лёс». Маст. фільм (12+).**

## Беларусь 5

**7.10** Валейбол. Адкрыты чэмпіянат Расіі. «Мінчанка» (Беларусь) — «Дынама-Краснадар» (Расія).
**9.05** Вынікі тыдня.
**9.50** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. УНІКС (Казань) — «Цмокі-Мінск».
**11.35** Спорт-мікс.
**11.45** Вялікі спорт.
**12.30** Біятлон. Этап Кубка свету. Нове-Места. Масстарт. Мужчыны.
**13.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Эвертан» — «Тотэнхэм».
**15.15** Піт-стоп.
**15.45** Біятлон. Этап Кубка свету. Нове-Места. Масстарт. Жанчыны.
**16.35** Авертайм. КХЛ.
**16.55** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «АК Барс» (Казань). (У перапынках — Авертайм. КХЛ.)
**19.35** Спорт-цэнтр.
**19.50** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Хімкі» (Маскоўская вобл.) — «Зеніт» (Санкт-Пецярбург). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**21.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**22.35** Змешаныя адзінаборствы. UFC.

## АНТ

**7.00, 9.00, 16.00, 20.30** «Нашы навіны».
**7.10 Камедыя «Карнавальная ноч» (0+).**
**8.55, 18.40** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**9.10** «Контуры».
**10.00** «Жыць здарова!» (16+).
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.15 Мюзікл «Ла-Ла Лэнд» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+).
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.25** «На самай справе» (16+).
**18.45** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10 Серыял «Чужая кроў» (16+).**
**22.05 Серыял «Мурка» (16+).**
**0.10 Маст. фільм «12 калядных жаданняў» (12+).**

## СТБ

**6.00** «Вялікі горад».
**6.30, 21.50** «Як устроены свет» (16+).
**9.05** «Скардзіцца дазваляецца».
**9.25** «Тыдзень».
**10.30** «Вёска Live» (12+).
**11.20, 13.40** «Залатая калекцыя беларускай песні». Найлепшае.
**13.30, 16.30, 19.30** Навіны «24 гадзіны».
**14.00, 0.15 «Сцеражыся аўтамабіля». Камедыя (12+).**
**15.45, 16.40 «Саша + Даша + Глаша». Серыял (16+).**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 «Джэнтльмены, удачы!» Камедыя (12+).**

## МІР

**6.00, 10.10 Серыял «Паляванне на гаўляйтара» (12+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны.
**13.15** «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
**14.00** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Гульня ў кіно» (12+).
**17.00 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.20, 2.25 Серыял «Даішнікі» (16+).**
**0.10** Дак. фільм «Дарога ў храм» (12+).
**0.40 Маст. фільм «Моцная слабая жанчына» (16+).**

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.30, 14.30, 22.30 Серыял «Тайны спадарыні Кірсанавай» (12+).**
**13.40** «Наша справа» (16+).
**15.35** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.00** Весткі. Мясцовы час.
**17.25** «Лёс чалавека» (12+).
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.00** Весткі.
**20.40 Серыял «Тайны следства-18» (12+).**
**0.15** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**6.20** «Астрапрагноз».
**6.25** «Terra incognita. Беларусь невядомая» (6+).
**7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** «Сёння».
**7.10** «Паедзем, паядзім!» (0+).
**8.05 Серыял «Мухтар. Новы след» (працяг) (16+).**
**9.40** «Спецыяльны рэпартаж» (12+).
**10.20 Серыял «Масква. Тры вакзалы» (16+).**
**13.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**14.05 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**16.40** «Справа ўрачоў» (16+).
**17.45** «ДНК» (16+).
**19.45 Серыял «Адэсіт» (16+).**
**23.20 Серыял «Агент асобага прызначэння» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.55, 19.55, 21.00, 0.05** «Надвор'е».
**7.05** М/с.
**7.25, 16.00** «Гумарынка».
**7.30 Серыял «Два з паловай чалавекі» (16+).**
**8.30 Серыял «Касл» (16+).**
**9.15 Меладрама «Рэальнае каханне» (16+).**
**11.45 Меладрама «Заплаці іншаму» (12+).**
**13.50 Серыял «Пунсовыя сэрцы» (12+).**
**16.05** Мультпарад. «Чароўны меч» (0+).
**17.25** «Адказвайка» (0+).
**17.30 Серыял «Містар Хутэн і лэдзі» (12+).**
**19.10 Серыял «Не сваё цела» (16+).**
**20.00 Серыял «Арэлі» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05 Камедыя «Калядныя прыгоды» (12+).**
**23.05 Драма «Знаёмцеся, Джо Блэк» (16+).**



## ВТБ

**6.05** Серыял «Улётны экіпаж-2» (16+).
**7.10, 1.45** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**8.10** «Турбаміксер» (16+).
**9.00** М/ф «Тры каты» (0+).
**9.25** М/ф «Ліга Watchcar» (0+).
**9.55** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**10.25, 14.00, 20.30** «Уральскія пельмені» (16+).
**11.25** «Проста кухня» (16+).
**11.55** «Паспець за 24 гадзіны» (16+).
**13.00** Прыгоды «Сцюарт Літл-2» (6+).



**14.25** Фантастыка «Паляўнічыя на прывіды» (6+).
**16.25** Фантастыка «Паляўнічыя на прывіды-2» (12+).
**18.30** Анімацыйны фільм «Сакрэтная служба Санта-Клаўса» (0+).
**20.20** Камедыя «Кухня ў Парыжы» (12+).
**22.10** Камедыя «Раство з нядуачнікамі» (12+).
**0.00** Трылер «Код да Вінчы» (18+).
**2.30** Жахі «Прывід» (16+).
**4.00** «Лаві момант» (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі» (16+).

## Культура

**6.30** «Сіта і Рама». Серыял.
**10.20** «Тыграня на сапечніку». М/ф.
**10.35** «Звычайны канцэрт».
**11.00** «Тэлескоп».
**11.30** «Шафёр на адзін рэйс». Маст. фільм.
**13.50, 2.00** «Снежныя мядзведзі». Дак. фільм.
**14.45** «Найвялікшае шоу свету». Маст. фільм.
**17.15** Да 90-годдзя з дня нараджэння Тацця-ны Шмыгі. «Больш, чым каханне».
**18.00** «Дайце кнігу скаргаў». Маст. фільм.
**19.30** Навіны культуры.
**20.10** «Клуб 37».
**21.45** «Скінь маму з цягніка». Маст. фільм.
**23.10** ХХ стагоддзе. «Песня-74. Фінал».
**0.40** Хасэ Карэрас, Пласіда Дамінга, Лучана Паваroці. Калядны канцэрт. Запіс 1999 года.

## Настальгія

**6.00, 9.45, 15.55, 20.45, 0.40, 2.45, 3.45** Музычная настальгія (12+).
**6.10, 12.10** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1991. 2008 год (18+).
**7.25, 13.30, 20.40** «Прэс-экспрэс». 1994 год (16+).
**7.40** Маст. фільм «Позняя сустрэча» (16+).
**9.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00** «Колба часу» (16+).
**11.00, 17.00, 23.10, 5.05** «Песня-87» (12+).
**13.45** «У коле сяброў». 1986 год (12+).
**15.00** «Быў час». 2008 год (16+).
**16.20** Маст. фільм «Гісторыя аднаго кухталя» (12+).



**18.00** «Аншлаг! Аншлаг!» 1988 год (12+).
**19.15** «Навагодні лабірынт». 1985 год (12+).
**21.50** Маст. фільм «Верыш, не верыш» (16+).

**0.00** «Яловая субмарына». Жанна Агузарава. 2005 год (12+).
**1.15** «Музычны рынг». 1989 год (16+).
**4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).

## EuroSport 1

**0.00, 4.30, 8.00** Біятлон. «Калядная гонка».
**1.00, 3.30, 6.00, 9.00, 12.30, 15.45, 17.45,** 22.00 Скачкі на лыжах з трампліна. «Турнэ чатырох трамплінаў».
**2.00, 7.00, 10.00, 11.30** Горныя лыжы. Кубак свету.
**10.30, 13.30, 16.30, 20.30, 23.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету.

## Кінакамедыя

**0.35** Таткі без школьных звычак (16+).
**2.30** Пад маскай жыгала (16+).
**4.15** Навагодні адрыў (16+).
**5.50** Няўдачлівыя (16+).
**7.30** Іронія кахання (16+).
**9.10** Ура! Канікулы! (6+).
**11.10** Добры, дрэнны, гвазданутy (18+).
**13.50** Дапамажыце стаць бацькам (16+).
**15.40** Гульні (16+).
**17.40** Дзень выбараў па-французску (16+).
**19.30** Тарыф «Навагодні» (12+).
**21.05** Незадаволенае сексуальнае напружанне (18+).
**22.55** Хот-дог (18+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**10.00** Калекцыя «Беларусьфільма». «Пітэр Пэн». Фільм-казка (6+).
**12.35** «Паненка і кулінар» (12+).
**13.10** «Пасылка з Марса». Серыял (12+).
**15.30** «Снежная бітва». Анімацыйны фільм (6+).
**17.00, 2.00** «Тры шчаслівыя жанчыны». Маст. фільм (12+).
**20.40** «Без падману» (16+).
**21.35** «Асцярожна: махляры!» (16+).
**22.10** «Сем'янін». Фэнтэзі (12+).
**0.30** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**5.05** «Леанід Агуцін. «Ад свайго «я» не адмаўляюся». Дак. фільм (12+).

## ТВ1000

**6.10, 18.15** Васабі (16+).
**8.05** Джулі і Джулія: рыхтуем шчасце па рэцэпце (16+).
**10.30** Агент Джоні Інгліш (12+).
**12.20** Сямейка Крудс (6+).
**14.20** Жонка падарожніка ў часе (16+).



**16.25** Монстры на канікулах (6+).
**20.10** У пагоні за шчасцем (12+).
**22.30** Белфегор — прывід Луўра (12+).
**0.25** Бачылі ноч (18+).
**2.10** Павуцінне хлусні (16+).
**4.20** Пабочны эфект (16+).

## ТВ1000 Рускае кіно

**6.20** Сябры сяброў (16+).
**8.20** Каханне з абмежаваннямі (16+).
**10.25** Піцер FM (12+).
**12.20** Дабрыня Мікіціч і Змей Гарыныч (12+).
**13.55** Русалка. Возера мёртвых (16+).
**15.45** Паляўнічы-4. Адплата (16+).
**18.00** Манах і Д'ябал (12+).
**20.20** Навагодні перапалох (12+).



**22.10** За гранню рэальнасці (12+).
**0.20** Кококо (18+).
**2.10** Навагодні тата (12+).
**4.10** Князёўна Мэры (12+).

## National Geographic

**6.00, 5.15** Навуковыя недарэчнасці (16+).
**6.15** Космас: прастора і час (16+).
**7.40, 4.30** Аўта-SOS (12+).
**9.15** Дзікі тунец (16+).
**10.50, 17.10** Марс і SpaceX (16+).
**11.35** Інстынкт выжывання (16+).
**13.10** Гісторыя Бога (16+).
**14.55** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**18.00, 22.00** Марс (16+).
**22.50, 3.40** Невядомая планета зямля (16+).

## Discovery

**8.00** Як гэта ўстроена? (12+).
**10.00, 4.40** Майстры зброі (16+).
**11.00, 3.50** Небяспечная праца (16+).
**12.00, 23.00** Махінатары (12+).
**13.00, 2.55** Музейныя тайны (12+).
**14.00, 2.00** Мужчынскія бярлогі (12+).
**15.00** Скарбы з каморкі (12+).
**18.00, 22.00** Круты цюнінг (12+).
**0.00** Апошні ніндзя (16+).
**1.00** Залатая ліхаманка (16+).
**5.30** Выжыць разам (16+).

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*

## Беларусь 1

6.25 Слова мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на дзень Святой Сям'і.
**6.35 Меладрама «40+ (плюс), або Геаметрыя пачуццяў» (16+).**
8.30 «Гісторыі выратавання» (12+).
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал» (12+).
9.45 «Маршрут пабудаваны». Навагодні маршрут па Мінскім раёне (12+).
10.25 «Народная раніца» (6+).
11.05 «Вакол планеты».
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 «50 рэцэптаў першага» (12+).
**13.15 Меладрама «Шлях скрозь снягі» (12+).**
15.15 «Твой горад».
**15.30 Серыял «Сваты» (12+).**
**16.55 Меладрама «Іншы» (16+).**
20.35 Навіны надвор'я.
21.00 «Галоўны эфір».
**22.10 Меладрама «Я ніколі не плачу» (16+).**

## Беларусь 2

7.00 М/с «Усё пра Розі» (0+).
**7.30 Фільм для дзяцей «Тры арэшкі для Папялушкі» (12+).**
8.50, 19.55 «Тэлебарометр».
8.55 М/с «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу» (0+).
9.55 «Веру не веру» (16+).
10.50 «ЖаннаПакажы» (16+).
11.50, 23.45 «Арол і рэшка. Кругасветка» (16+).
**12.50 Баявік «Мсціўцы» (12+).**
15.15 «Вясельны памер» (16+).
**16.15 Прыгоды «Аліса ў Краіне цудаў» (12+).**
**18.05 Прыгоды «Аліса ў Залюстроўі» (6+).**
20.25 «Абмен жонкамі» (16+).
22.00 «Спортлато 5 з 36», КЕНО.
22.05 «Трэці лішні» (16+).
23.05 «Хадзі сюды і танцуй».
23.10 «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).

## Беларусь 3

7.35, 15.45, 20.15 Навіны культуры.
7.55, 16.05, 20.35 «Гэты дзень».
8.00 М/ф (0+).
**8.15 «Дзяўчына з гітарай». Камедыя (12+).**
9.50 «Наперад у мінулае».
10.30 «Беларуская кухня». Курыца, запечаная ў цесце.
11.00 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+).
11.25 «Спявае Беларусь».
**12.15 «Вяселле ў Малінаўцы». Камедыя (12+).**
13.50 «Майстры і куміры». Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Аляксандр Саладуха.
14.40 «Гэта — шчасце». Спявае Аляксандр Саладуха.
**16.10 «Падкідыш». Камедыя (6+).**
17.20 Канцэрт BIA «Синяя птица».
**18.15 «Вялікая сям'я». Маст. фільм (12+).**
20.00 «Архітэктура Беларусі».
20.40 «Калыханка» (0+).
**21.05 «Зімовы вечар у Гаграх». Маст. фільм (12+).**
22.35 «Камертон». Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Ігар Сігоў.
23.00 Гала-канцэрт фіналістаў V Мінскага міжнароднага Калядняга конкурсу вакалістаў.

## Беларусь 5

6.00, 23.35 Змешаныя адзінаборствы. UFC.
8.00 Валейбол. Чэмпіянат Расіі. «Мінчанка» (Мінск) — «Дынама-Метар» (Чалябінск).
10.05 Спорт-мікс.
10.15 Хакей. Маладзёжны чэмпіянат свету. Канада — Чэхія.
12.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Тотэнхэм» — «Вулверхэмптан».
14.20 Піт-стоп.
14.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Крыстал Пэлас» — «Чэлсі».
16.50 Хакей. КХЛ. «Лакаматыў» (Яраслаўль) — «Дынама-Мінск». (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
19.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Юнайтэд» — «Борнмут». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
21.20 Вынікі года.
22.05 Футбол. Чэмпіянат свету — 2018. Вынікі.

## АНТ

7.00, 9.00, 16.00 (з субцітрамі) «Нашы навіны».
**7.10 Фільм-казка «Варвара-краса, доўгая каса» (0+).**
8.45 М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
9.10 «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
9.25 Навагодні канцэрт Міхаіла Задорнава.
**11.00 Серыял «Навагодні рэйс» (16+).**
15.00, 16.20 «Тры акорды» (16+).
17.10 «Эксклюзіў» (16+).
18.50, 21.05 Цырымонія ўручэння народнай прэміі «Залаты грамафон» (16+).
20.00 «Контуры».
23.15 «Што? Дзе? Калі?» Фінал года (16+).
1.05 «Вячэрні Ургант» (16+).

## СТБ

6.25 «Ежа багоў» (16+).
8.10, 22.15 Дакументальны спецпраект (16+).
10.00 «Вёска Live».
10.50 «Цэнтральны рэгіён».
**11.20, 13.40, 16.40 «Пад абцасам». Серыял (16+).**
13.30, 16.30 Навіны «24 гадзіны».
19.30 «Тыдзень».
**20.35 «Горка!-2» Маст. фільм (16+).**
23.10 «Тыдзень спорту».
**23.40 «Дванаццаць крэслаў». Камедыя (6+).**

## МІР

6.00, 7.25, 5.00 М/ф (0+).
6.10 «Мільён пытанняў пра прыроду» (6+).
6.25 «Народжаныя ў СССР» (12+).
**8.10 Маст. фільм «Агонь, вада і медныя трубы» (12+).**
10.00, 16.00 Навіны.
10.15, 4.15 Дак. фільм «Новы год. Сустракаем разам» (12+).
11.10 «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
**11.40, 2.40 Маст. фільм «Пунсовыя ветразі» (12+).**
**13.25 Маст. фільм «Фініст — Ясны сокал» (12+).**
**15.0, 16.15, 19.30 Маст. фільм «Д'Артаньян і тры мушкецёры» (0+).**
18.30 «Разам».
**21.35 Маст. фільм «Шукайце жанчыну» (0+).**
**0.30 Маст. фільм «Папялушка» (12+).**

## РТР—Беларусь

7.00 «Пернікавы домік».
**7.30 Маст. фільм «Тэорыя неверагоднасці» (12+).**
11.00 Вескі.
**11.20 Маст. фільм «Нялюбы» (12+).**
14.50 «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт.
**16.50 Маст. фільм «Родныя пенаты». (16+).**
20.00 Весткі тыдня.
**21.45 Маст. фільм «Навагодняя жонка» (12+).**
23.30 Масква. Крэмль. Пуцін.
0.20 «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

5.50 «Астрапрагноз».
5.55 «Terra incognita. Беларусь невядомая» (6+).
6.30 «Экспертыза злачынстваў» (16+).
**7.05 Серыял «Рускі дубль» (16+).**
8.00, 10.00, 16.00, 19.00 «Сёння».
8.20 «Паедзем, паядзім!» (0+).
8.15 «Урачэбныя тайны плюс» (12+).
9.45 «Спецыяльны рэпартаж» (12+).
10.25 «Галоўная дарога» (16+).
11.05 «Цуд тэхнікі» (12+).
12.00 «Кватэрнае пытанне» (0+).
13.10 «НашСпажыўНагляд» (16+).
**14.15 Серыял «Асноўная версія» (16+).**
16.25 «Следства вялі...» (16+).
**18.05, 19.30 Дэтэктыў «Пёс» (16+).**
22.30 «Найвышэйшая ліга-2018». Музычная прэмія (12+).

## 8 канал

7.00, 15.05, 18.55, 21.05, 0.05 «Надвор'е».
7.05 М/ф «Баранчык Шон».
7.15 Дак. серыял «Малыя» (0+).
8.00 М/ф «Галаваломка».
9.40 «Утрамдзія».
9.45 «Мой любімы гадаванец» (0+).
**10.15 Маст. фільм «Гардэмарыны, наперад!» (12+).**
**15.10 «Глядзім усёй сям'ёй». Камедыя «Чарадзеі» (6+).**
17.40 «Адказвайка» (0+).
17.45 «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**18.00 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).**
**19.00 Камедыя «Прышэльцы. Калідоры часу» (12+).**
20.55 «Вечарніца» (0+).
**21.10 Баявік «Праўдзівая хлусня» (16+).**
**23.25 Камедыя «Аперацыя «Ы» і іншыя прыгоды Шурыка» (12+).**



## ВТБ

6.05 Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
6.50 Серыял «Татавы дочкі» (12+).
7.55 «Турбаміксер» (16+).
8.45 М/ф «Тры каты» (0+).
9.10 М/ф «Джынглікі» (0+).
9.40 М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
10.10 «Шоу выхаднога дня» (16+).
11.15 «Турысты» (16+).
12.20 Серыял «Улётны экіпаж-2» (16+).
14.25 Фантастыка «Людзі ў чорным» (12+).
16.20 Фантастыка «Людзі ў чорным-2» (12+).
18.00 Фантастыка «Людзі ў чорным-3» (12+).
20.00 Фантастыка «Паляўнічыя на прывіды» (6+).
22.05 «Уральскія пельмені» (16+).
0.10 Камедыя «Удачы, Чак!» (18+).
1.50 Серыял «Псіхалагіні» (16+).
3.40 «Ералаш» (6+).
4.00 «Лаві момант» (16+).
5.00 «Дурні і дарогі» (16+).

## Культура

6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» Масква мемарыяльная.
7.05 «Легенды сусветнага кіно». Ромі Шнайдэр.
7.35 «Вяселле». Маст. фільм.
8.35 Да 100-годдзя Тэатра марыянетак імя А. С. Дземяні. Дак. фільм.
9.05, 17.40 «Жыццё па законах стэпаў. Манголія». Дак. фільм.
10.15 «Назіральнік».
11.10, 1.40 XX стагоддзе. «Гарадок». 1997 год.
12.10 «Продкі нашых продкаў». Дак. серыял.
12.50, 1.25, 2.35 Сусветныя скарбы.
13.10 «Малады Карузa». Маст. фільм.
14.30 Урокі рускай. Чытанні. Саша Чорны. «Маскоўскі выпадак». Чытае Барыс Няўзораў.
15.10 «Царыца над царамі. Ірына Бугрымава». Дак. фільм.
15.35 «Бетховен. Геранізм духу».
16.35 «Агора». Токшоу.
18.35 Успамінаючы Алега Анофрыева. «Лінія жыцця».
19.45 «Галоўная роля».
20.05 «Саці. Нясумная класіка...»
20.50 Юбілей Акадэміі рускага балета імя А. Я. Ваганавай.
23.50 «Раства ў Вене».

## Настальгія

6.00 Маст. фільм «Маё каханне» (12+).
7.10, 11.40, 15.45, 17.20, 19.10, 20.45, 21.45, 1.00, 2.35, 3.45, 5.00 Музычная настальгія (12+).
7.30 «Аншлаг! Аншлаг!» 1987 год (12+).
8.50 «Прэс-экспрэс». 1994 год (16+).
9.00 «Быў час». 2008 год (16+).
10.00 «Пад знакам задыяка». «Казярог». 1992 год (16+).
11.55 «Песня-83» (12+).
13.45 «Вясёлыя рабяты». 1985 год (12+).
15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
16.00 Фільм-спектакль «Не заплачу!» 1983 год (12+).
18.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Эміграцыя». 2005 год (18+).
19.25 «Майстры мастацтваў. Алег Басілашвілі». 1984 год (12+).
22.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
23.05 «Песня-81» (12+).
0.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1982. 1-я частка. 2011 год (16+).
1.30 Маст. фільм «Прос-та Саша» (16+).
4.00 «Колба часу» (16+).
5.05 «Песня-85». 3-я частка (12+).

## EuroSport 1

0.15, 3.00, 15.30 Фрыстайл. Кубак свету.
1.00 Горныя лыжы. Кубак свету.
1.30, 3.30, 6.00, 14.30, 16.30 Біятлон. Кубак свету.
2.30, 4.30, 13.3.5 Лыжнае двабор'е. Кубак свету.
7.00, 17.00, 21.00 Скачкі на лыжах з трампліна. «Турнэ чатырох трамплінаў».
8.00, 9.30, 19.30, 22.00 Алімпійскія гульні. «Зала славы».
9.00 Алімпійскія гульні. «Алімпійская спадчына».
10.30, 12.30 Алімпійскія гульні. «Анатомія спорту».
13.30, 21.00 Дзюдо.
18.00 Алімпійскія гульні. «Людзі-байцы».
20.30 Дзюдо. «Мастэрс».

## Кінакамедыя

0.35 Робін Гуд (16+).
3.00 Кахае не кахае (16+).
4.35 З рэчамі на вылет! (16+).
6.20 Хот-дог (18+).
8.30 Таткі без школдных звычак (16+).
10.25 Пад маскай жыгала (16+).
12.10 Да чорта на рогі (16+).
13.55 Ура! Канікулы! (6+).
15.45 Чацвёра супраць банка (16+).
17.35 Завадатары (16+).
19.30 Офіснае бязмежжа (18+).
21.10 Мігатлівыя агні (16+).
23.20 Гульні (16+).

## ТБ3

6.00 М/ф (6+).
7.15 «Рыжы. Сумленны. Закаханы». Фільм-казка (6+).
9.50 «Асколкі». Серыял (16+).
11.20 «Глядзі сам» (12+).
11.35 «Перыскоп» (16+).
12.00 «Асцярожна: махляры!» (16+).
12.35 «Без падману» (16+).
13.25 «Сёмы госць». Маст. фільм (12+).
15.15 «Нераскрытыя тайны» (12+).
16.15 «Мой герой» (12+).
17.10 «Развітанне» (16+).
18.05 «Зорнасць на карысць». Дак. фільм (12+).
19.40 «Грамадзянка Кацярына». Серыял (12+).
23.15 «Прывітанне сям'і». Маст. фільм (12+).
1.10 «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
1.50 «Золата дурняў». Трылер (16+).
3.35 «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
5.05 «Часова даступны» (12+).

## ТБ1000

6.10, 13.55 Скнара (16+).
8.00 Трывожны выклік (16+).
9.50 Рок Дог (6+).
11.40 Змрочныя цені (16+).
15.45 Спяшайся кахаць (12+).
17.45 Эд з тэлевізара (12+).
20.10 Муза (16+).
22.05 Моладзь (16+).
0.05 Каралева Іспаніі (18 +).
2.30 Прыстанак зла: адплата (18+).
4.10 Тата-дасвідос (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Ёлкі-3 (6+).
8.20 Каханне ў горадзе анёлаў (16+).
10.00 Нягоднік (16+).
12.00 Поп (16+).
14.35 Востраў шанцавання (16+).
16.20, 4.20 Навагодні шлюб (12+).
18.20 Іван (6+).
20.20 Снежны анёл (12+).
22.25 Прыстойныя людзі (16+).
0.20 Памяць восені (16+).
2.20 Ёлкі (12+).
Пры зносінах з дэпутатамі Віктар Чайчыц пераканаўся: далёка не ўсе бачаць плюсы ў стварэнні і дзейнасці асацыяцыі і ўяўляюць, як з яе дапамогай можна вырашаць праблемныя пытанні ў дзейнасці органаў мясцовага самакіравання.

## Прываблівае прынцып добраахвотнасці

Дзеля справядлівасці ён адзначыў, што да стварэння асацыяцый большасць дэпутатаў адносіцца станоўча. І нават тыя, хто добра і паспяхова працуюць, разумеюць: з дапамогай гэтай структуры можна будзе працаваць яшчэ лепш. Прываблівае перш за ўсё прынцып добраахвотнасці і магчымасць прыцягваць сродкі, а таксама тое. Што так працай арганізацыю людзей на добрыя справы.

— Акрамя таго дэпутаты, якія выступаюць у падтрымку стварэння асацыяцый, мяркуюць, што з ёй будуць больш лічыцца рэспубліканскія дзяржаўныя органы і не ўзнікнуць сітуацыі, калі на высокім дзяржаўным узроўні прымаецца рашэнне аб будаўніцтве завода або культурна-масавай установы без уліку меркавання людзей і як вынік — пратэсты ад мясцовага насельніцтва, — падкрэсліў ён.

Яшчэ адным «за» пры стварэнні асацыяцый, па словах Віктара Чайчыца, апытаныя ім дэпутаты лічаць магчымасць карыстацца юрыдычным суправаджэннем.

— На жаль, часам (у тым ліку і на мясцовым узроўні) дэпутаты лічаць, што можна нешта хутка стварыць у інтарэсах людзей. Наколькі гэта законна — задумваюцца не заўсёды, — звярнуў ён увагу. І ў якасці прыкладу прывёў арганізацыю работ па ўладкаванні спартыўнай пляцоўкі для дзяцей па ініцыятыве дэпутата. Усё зрабілі добра, але не прадумалі, як яна будзе працаваць? Ці не нясе яна пагрозу для дзяцей? На думку сенатара важна, каб пры дапамозе асацыяцыі на належным узроўні вялося юрыдычнае суправаджэнне.

У якасці яшчэ аднаго плюса на карысць стварэння асацыяцыі парламентарый назваў упэўненасць апытаных дэпутатаў у тым, што з яе → с. 14

**Святлана ЯЗЕРСКАЯ, старшыня Слаўгарадскага раённага Савета дэпутатаў:**

*— Сёння мы можам казаць пра павелічэнне сацыяльнай актыўнасці грамадзян, гэтаму спрыяе вопыт узаемадзеяння ў праектнай дзейнасці з міжнароднымі структурамі. Актыўна развіваецца турыстычная галіна, рэалізуючы сумесныя з замежнымі партнёрамі праекты. Падтрымана 21 мясцовая ініцыятыва жыхароў і арганізацый на суму 120 тысяч еўра, якія накіраваны на развіццё сельскага і экалагічнага турызму, аграсядзіб, рамёстваў, сыраварэння. Створана шэсць новых турыстычных маршрутаў, праводзіцца работа па іх інтэграцыі ў рэгіянальныя і нацыянальныя турыстычныя сеткі.*

*У выніку рэалізацыі мясцовай ініцыятывы «Музей пад адкрытым небам» у рамках усё таго ж праекта ЕС/ПРААН у аграгарадку Лясная з'явіўся яшчэ адзін аб'ект, прысвечаны падзеям часоў Паўночнай вайны 1700—1721 гадоў.*

*Ужо стала брэндам раёна хатняе сыраварэнне: каля 40 хатніх гаспадарак робяць сыр для сябе і на продаж. Пры актыўнай падтрымцы сельскага Савета дэпутатаў быў створаны спажывецкі сельскагаспадарчы кааператыў «Гіжанскі аграрый». На сённяшні дзень у яго ўваходзяць 15 сыравараў, кааператыў рэалізуе праект «Падтрымка хатняга сыраварэння як альтэрнатыўнай формы занятасці» пры падтрымцы малых грантаў ПРААН / ГЭФ. У аграгарадку Лясная адкрылася сырная крама, дзе з'явіўся міні-музей сыру, яго тут можна набыць і навучыцца рабіць.*

*Штогод праходзіць фестываль народных промыслаў «Гаспадарчы сыр», дзе мясцовыя сыравары дэманструюць да 50 гатункаў мяккага сыру, прыгатаванага ў хатніх умовах.*

*Рэалізацыя розных ініцыятыў дазволіла ўцягнуць 31 рамесніка, што займаюцца вышыўкай, лозапляценнем, вяжуць карункі, ткуць паясы, вырабляюць лялькі, вараць мыла, зарабляюць дрэваапрацоўкай, мастацкім каваннем металу. Адкрыўся салон-магазін у аграгарадку Лясная па продажы сувеніраў і рамесніцкіх вырабаў. Створаны клуб майстроў-рамеснікаў «Майстры Слаўгарадчыны».*

*У раёне рэалізуецца шэраг сумесных з замежнымі партнёрамі праектаў, з дапамогай якіх у эканоміку раёна прыцягнута звыш 81,8 мільёна рублёў.*

*Для далейшага развіцця прадпрымальніцтва мы плануем рэалізаваць праект «МОСТ як пілотная эка-бізнес-мадэль для мясцовага і рэгіянальнага эканамічнага росту», у рамках якога запланаваны мерапрыемствы па развіцці тэрыторый левабярэжжа ракі Сож і створаны Цэнтр сельскага прадпрымальніцтва на базе трох будынкаў, што не ў вёсцы Старая Каменка. Бюджэт праекта — 600 тысяч еўра.*

*Таксама рэалізуем другі праект сумесна з чатырма раёнамі паўднёвага ўсходу Магілёўскай вобласці «Сеткавае ўзаемадзеянне для паляпшэння магчымасцяў працаўладкавання ў сельскіх раёнах Магілёўскай вобласці», падтрыманы Еўрапейскай камісіяй.*

**Алена ШКЕЛДА, староста аграгарадка Кальчуны Ашмянскага раёна:**

*— На тэрыторыі сельсавета 35 сельскіх населеных пунктаў, у якіх жывуць каля трох тысяч чалавек, у сельсавеце працуюць 16 старастаў. Дзякуючы сумесным намаганням мы зрабілі столькі працы на карысць людзей, не ўзяўшы ні капейкі ў дзяржавы. Напісалі праект, які выйграў. Так, у 2015 годзе быў рэалізаваны праект дзейнасці клуба старастаў вёсак «Культура кіравання тэрыторыяй» (ККТ). Праект стаў сапраўдным прыкладам грамадзянскага ўдзелу ў мясцовым самакіраванні. Стварылі клуб старастаў вёсак, на базе бібліятэкі працуе сацыяльна-інфармацыйны цэнтр з групай валанцёраў. Ініцыятыва праекта ішла ад групы мясцовых актывістаў і прадстаўнікоў грамадскасці, якую я ўзначальвала.*

*Было відавочна, што рэалізацыя праекта будзе спрыяць актыўнасці вырашэння пытанняў сельскага жыцця ў людзей. Скажу, што вынікам конкурсу «Добрая справа» сталі пасаджаны грамадскі сад у вёсцы Мардасы, адрамантаваны мост у вёсцы Будзёнаўка і пабудаваная дзіцячая пляцоўка ў Кальчунах. Хачу сказаць, што наш грамадскі сад ужо два гады дае плады, якія мы аддаём у інтэрнаты, дзіцячыя прытулкі і пажылым людзям.*

*Конкурс «Найлепшы гаспадар — 2014» паказаў імкненне людзей у аддаленых вёсках добраўпарадкоўваць асабістыя падворкі, палепшыць эстэтычны выгляд сваіх дамоў. Не менш значным стаў і дзіцячы творчы конкурс «Мой родны кут». Ён быў самым шматлікім па колькасці ўдзельнікаў, дзеці ў мастацкай форме паказалі сваю любоў да малой радзімы.*

*Конкурсы, якія праводзіліся, сталі добрым стымулам для павышэння актыўнасці простых людзей, цікавасці да таго, што адбываецца, жадання паказаць і праявіць сябе. Напрыклад, калі прапановы на конкурс «Добрая справа» не разглядаліся па шэрагу прычын членамі журы, яны самастойна рэалізоўваліся жыхарамі.*

*Паралельна на базе Кальчунскай бібліятэкі стварыўся сацыяльна-інфармацыйны цэнтр. Для яго дзейнасці закуплена абсталяванне: інфармацыйны стэлаж, праектар, экран, ноўтбук, ткацкі станок, тэнісны стол, танометр і тры хуткасныя веласіпеды для валанцёраў. І ўсё гэта актыўна выкарыстоўваецца ў працы. Валанцёры выязджаюць у аддаленыя вёскі, дастаўляюць пажылым людзям і інвалідам літаратуру, прывозяць лекі, вымяраюць ціск, дапамагаюць па гаспадарцы. Набытае абсталяванне дазваляе ажыццяўляць абслугоўванне жыхароў і стацыянарна, а таксама з выездам у малыя населеныя пункты.*

*Самым гучным і значным мерапрыемствам праекта стаў фестываль народнай культуры «КУТарскі фэст», у праграме якога працавалі пляцоўкі народных умельцаў з майстар-класамі, выстаўкі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, ладзілася выступленне самадзейных артыстаў.*

*Поспех праекта абумоўлены тым, што ініцыятыўная група грамадзян аб'яднала вакол сябе неабыякавых актыўных людзей, гатовых удзельнічаць у вырашэнні пытанняў мясцовага значэння. Стрыжнёвай ідэяй праекта было стварэнне клуба старастаў, які і цяпер працягвае сваю работу. Сёння ў склад клуба ўваходзяць 11 старастаў з 16. Але клуб адчынены не толькі для іх, але і для сельскіх актывістаў.*

*Адметная асаблівасць праекта ў тым, што наўпрост ці ўскосна былі задзейнічаны ўсе жыхары населеных пунктаў сельскага Савета. У сацыяльна-інфармацыйныя цэнтры можна з карысцю правесці час: пачытаць газеты, жанчыны асвойваюць ткацкі станок, мужчыны і моладзь гуляюць у тэніс, пажылыя людзі ў вёсках чакаюць валанцёраў з літаратурай, старасты з работнікамі культуры арганізуюць сустрэчы для насельніцтва з цікавымі праграмамі. Усё гэта паспяхова працуе і сёння.*

# З УЛІКАМ



дапамогай будзе больш эфектыўна весцися падрыхтоўка кадраў для органаў мясцовага самакіравання, якіх не хапае.

Дарэчы, пытаннямі ўдасканалення сістэмы падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў для органаў мясцовага самакіравання ўдзяліў увагу і **Валерый БАРАДЗЕНЯ, першы прарэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь**. Ён расказаў «МС», якія ёсць магчымасці і праблемы з атрыманнем адукацыі прадстаўнікамі мясцовай улады.

Сярод відавочных плюсоў можна назваць тое, што дэпутаты мясцовых Саветаў у палове выпадкаў працуюць больш аднаго выбарчага тэрміну, а гэта значыць, што дасведчанаму складу не трэба з нуля атрымліваць веды, уменні і навыкі, якія неабходныя дэпутацкаму корпусу для эфектыўнай работы. Акрамя таго, суразмоўнік адзначыў высокі ўзровень інфармацыйнага развіцця грамадства і адукацыі насельніцтва наогул.

З адмоўных фактараў Валерый Барадзеня назваў адсутнасць базавай спецыяльнай падрыхтоўкі ўсіх дэпутатаў, бо далёка не ўсе народныя выбраннікі з першых дзён валодаюць неабходным вопытам.

Разам з тым мясцовыя бюджэты не заўсёды валодаюць сродкамі для павышэння кваліфікацыі персаналу, а таксама не заўсёды прадстаўнікі мясцовай улады могуць дакладна сфармуляваць запыт да адукацыйнай сістэмы.

У якасці выйсця навуковец прапануе выкарыстоўваць магчымасці сістэмы бесперапыннай адукацыі кадраў у сферы дзяржкіравання для мясцовых органаў кіравання: перыпадрыхтоўка кіруючых работнікаў і спецыялістаў, кароткатэрміновы курс павышэння кваліфікацыі і дадатковая адукацыя дарослых. І яшчэ, сістэму самаадукацыі таксама ніхто не адмяняў.

## За кошт чаго будуць існаваць асацыяцыі?

Аб гэтым «МС» расказала намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення бюджэтнай палітыкі — **начальнік упраўлення мясцовых бюджэтаў Міністэрства фінансаў Беларусі Таццяна АМЯЛЯШКА**.

Дарэчы, згодна з міжнароднай практыкай, асацыяцыі — самадастатковыя ўтварэнні, якія фінансуюцца дзякуючы членскім унёскам, грашам, што прыносіць камерцыйная дзейнасць створаных імі арганізацый, міжнародная тэхнічная, спонсарская дапамозе, ахвяраванням, а таксама даходам ад аказання розных відаў паслуг, выкарыстання маёмасці, што ім належыць, і гэтак далей.

А што ў нас?

— У Беларусі права стварэння асацыяцый мясцовыя органы самакіравання атрымалі адносна нядаўна — толькі ў 2010 годзе, — і далёка не ўсе паспяшаліся яго выкарыстаць. Таму, можна сказаць, мы знаходзімся на пачатковым этапе развіцця асацыяцый і, безумоўна, яшчэ трэба будзе шмат зрабіць і ўдасканаліць, — адзначыла суразмоўніца.

Але тая база, што існуе, дазваляе ствараць асацыяцыі ў форме юрыдычных асоб, якія маюць права весці фінансава-гаспадарчую дзейнасць. Іх маёмасць, згодна з заканадаўствам, ствараецца з унёскаў і іншых крыніц.

Разам з тым, шматлікія пытанні стварэння і функцыянавання асацыяцый, у тым ліку фінансавыя, аддадзены на «водкуп» мясцовым Саветам дэпутатаў — гэта значыць, іх заснавальнікам.

Заканадаўствам не размежаваны віды асацыяцый (напрыклад, змешанага віду, што ўключаюць Саветы ўсіх узроўняў) у залежнасці ад адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўзроўню (абласныя, раённыя, пярвічныя), не ўрэгулявана, колькі складаюць уступныя, членскія зносы, колькі разоў яны павінны плаціцца, і некаторыя іншыя пытанні.

Фактычна крыніцамі фінансавання дзейнасці дзвюх існуючых у краіне абласных асацыяцый з'яўляюцца сродкі мясцовых бюджэтаў, добраахвотныя ўзносы членаў, спонсарская дапамога. Разбяромся крыху падрабязней.

Бюджэтнае заканадаўства дазваляе забяспечваць пералік узносаў асацыяцый мясцовых Саветаў за кошт сродкаў бюджэтаў сельсаветаў, раённага і абласнога ўзроўняў.

— Да цяперашняга часу сродкі бюджэту накіроўваліся толькі Гродзенскай абласной Асацыяцыі, — кажа Таццяна Амяляшка. — Разам з тым сёлета сходам прадстаўнікоў Магілёўскай абласной Асацыяцыі таксама зацверджаны памер уступных і членскіх узносаў, якія плануецца пералічваць са сродкаў мясцовых бюджэтаў.

Дарэчы, гэтыя грошы ідуць на аплату працы штатных супрацоўнікаў, удзел Асацыяцыі ў міжнародных праектах, правядзенне семінараў, круглых сталоў, адукацыі.

Другой даходнай крыніцай, нагадаем, з'яўляюцца добраахвотныя ўзносы дэпутатаў мясцовых Саветаў. Штогод, звычайна, яны складаюць адну базавую велічыню. Гэтыя грошы ідуць на заахвочванне пераможцаў конкурсаў сярод сельскіх Саветаў, старастаў і камітэтаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, падшэфных арганізацый і гэтак далей.

Што датычыцца спонсарскай дапамогі, яна, згодна з заканадаўствам, выкарыстоўваецца выключна па мэтавым прызначэнні. Звычайна — на стварэнне матэрыяльнай базы: аргтэхніку, канцтавары і іншыя аналагічныя рэчы.

Між іншым, у якасці даходаў асацыяцый могуць быць працэнты за захаванне грошай на банкаўскім рахунку, а таксама ахвяраванні фізічных і юрыдычных асоб, сродкі з дзейнасці, што прыносіць даходы, а таксама эфектыўнага выкарыстання маёмасці, што знаходзіцца ва ўласнасці.

На думку суразмоўніцы, дадзеная заканадаўствам самастойнасць нясе за сабой і адпаведную адказнасць, якую не кожны гатовы прымаць. Кіраванне рэсурсамі патрабуе адмысловых навыкаў і ведаў, магчыма, таму мэтазгодна на заканадаўчым узроўні вызначыць «рамкі», у межах якіх асацыяцыі маглі б упэўнена функцыянаваць.

— Неабходнасць развіцця асацыяцый бясспрэчная. Мясцовы ўзровень улады — гэта кароткі і прамы кірунак да рашэння надзённых і жыццёва неабходных для чалавека праблем. Эфектыўнасць улады людзі вызначаюць па элементарных крытэрыях — цяпло ў дамах, асветленасць вуліц, якасць дарог, транспартнае забеспячэнне і гэтак далек. І вырашаць гэтыя пытанні мэтазгодна на месцах, там, дзе жывуць грамадзяне ,— у гарадах, пасёлках, вёсках, — рэзюмуе спецыяліст Мінфіна.

## Ці могуць зарабіць?

Прававыя асновы стварэння і дзейнасці асацыяцый мясцовых Саветаў дэпутатаў прааналізаваў **Вадзім ІПАТАЎ, дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Беларусі**. Ён паведаміў, што магчымасць стварэння асацыяцый замацавана ў артыкуле 7 закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні».

— Згодна з гэтай нормай мясцовыя Саветы дэпутатаў маюць права ствараць аб'яднанні ў форме асацыяцый мясцовых Саветаў дэпутатаў, — адзначыў ён.

Важным пунктам нормы закона, паводле яго слоў, з'яўляецца магчымасць стварэння Нацыянальнай асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў — сумесна з асацыяцыямі Саветаў і Мінскім гарадскім Саветам.

Дарэчы, законам прадугледжана, што яны рэгіструюцца ў якасці некамерцыйных арганізацый. Акрамя таго, Закон вызначае парадак фарміравання маёмасці такіх асацыяцый.

— Што датычыцца дзейнасці, якая прыносіць даходы, яе варта разглядаць з пункту гледжання нормаў Грамадзянскага кодэкса, — лічыць Вадзім Іпатаў.

Згодна з артыкулам 121 ГК, калі асацыяцыя вырашыць займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю, яна павінна перайтварыцца ў гаспадарчае таварыства, альбо стварыць для гэтых мэтаў камерцыйную арганізацыю.

— Такім чынам, магчымасць ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці для асацыяцый мясцовых Саветаў дэпутатаў без стварэння камерцыйнай арганізацыі павінна быць непасрэдна прадугледжана заканадаўствам, — звярнуў увагу дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў.

Ён адзначыў, што ў некаторых выпадках гэта можна адрэгуляваць пералікам у заканадаўчым акце канкрэтных відаў дзейнасці, што прыносяць даход, якімі мае права займацца тая ці іншая арганізацыя. А для прыкладу прывёў спартыўныя арганізацыі, створаныя згодна з Указам № 191 «Аб аказанні падтрымкі арганізацыям фізічнай культуры і спорту» ў форме грамадскіх аб'яднанняў (саюзаў, асацыяцый).

— Такім чынам, заканадаўчым актам, у прыватнасці законам «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь», можа быць прадугледжаны іншы, у адрозненне ад Грамадзянскага кодэкса, парадак вядзення прадпрымальніцкай дзейнасці асацыяцыямі мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Цяпер Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу рыхтуецца да разгляду ў першым чытанні праекта закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні». Пры неабходнасці законапраект можна дапоўніць адпаведнымі палажэннямі.

— Аднак варта разумець, што такі падыход — хутчэй выключэнне, чым правіла, і да яго трэба ставіцца вельмі асцярожна, старанна вызначыўшы, наколькі неабходна асацыяцыям мясцовых Саветаў дэпутатаў ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць, — перакананы Вадзім Іпатаў.

Ён таксама звярнуў увагу, што ў праект закона «Аб змяненні некаторых кодэксаў Рэспублікі Беларусь», па прапанове прадпрымальніцкіх аб'яднанняў, уключана норма, якая прадугледжвае выключэнне пункта 2 артыкула 121 ГК, што дасць магчымасць асацыяцыям займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю без неабходнасці стварэння камерцыйных арганізацый.

## Якое прадстаўніцтва неабходна?

Дарэчы, Вадзім Іпатаў не абмінуў магчымасці паразважаць над яшчэ адным складаным пытаннем:

— Ці дастаткова будзе двухтрох раённых Саветаў, каб ствараць рэгіянальную (абласную) асацыяцыю мясцовых Саветаў дэпутатаў?

— Так, дапусцім. Ці могуць тыя, што засталіся, Саветы Гродзенскай вобласці, якія не ўвайшлі ў склад дзеючай Гродзенскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў, стварыць, напрыклад, асацыяцыю мясцовых Саветаў дэпутатаў Гродзенскай вобласці, якая таксама будзе дзейнічаць ад імя гэтай вобласці?

# НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ІНТАРЭСАЎ

Паводле яго слоў, цяпер законам не вызначаны патрабаванні (квоты) для колькасці раённых Саветаў, якія дазваляюць ствараць, напрыклад, абласныя асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Адсюль лагічна ўзнікае пытанне і аб Нацыянальнай асацыяцыі мясцовых Саветаў. Яе стварэнне, згодна з законам, магчыма па сумесным рашэнні асацыяцый Саветаў і Мінскага гарадскога Савета. У Беларусі створаны і дзейнічаюць дзве абласныя асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў — Гродзенская і Магілёўская.

— Ці дастаткова гэтых дзвюх асацыяцый і Мінскага гарадскога Савета для стварэння Нацыянальнай асацыяцыі? — запытаўся ў прысутных Вадзім Іпатаў.

На яго думку, такой колькасці недастаткова, паколькі такая «Нацыянальная» асацыяцыя будзе прадстаўляць інтарэсы толькі малой часткі органаў мясцовага самакіравання і не будзе ахопліваць тэрыторыю ўсёй краіны. Магчыма, каб такая асацыяцыя была прадстаўнічай, яна павінна ўключаць больш за палову ад агульнай колькасці Саветаў адпаведнага рэгіёна.

Яшчэ адно пытанне. Як быць, калі ў рэгіёне ствараецца некалькі асацыяцый мясцовых Саветаў дэпутатаў?

— Улічваючы свабоду мясцовых Саветаў у вырашэнні пытання стварэння асацыяцый, ці не ўзнікнуць якія-небудзь праблемы ў сувязі з гэтым (напрыклад, калі ў межах аднаго раёна сельскія Саветы вырашаць аб'яднацца не ў адну, а ў 2—3—4 асацыяцыі)? — працягвае спікер.

У сувязі з гэтым вельмі важна ведаць, як рэгулююцца гэтыя працэсы ў замежных краінах, каб вырашыць, ці трэба дзяржаве рэгуляваць гэтыя і аналагічныя ім пытанні ці цалкам аддаць іх мясцовым Саветам дэпутатаў.

## Ці не атрымаем лабіраванне?

У **старшыні праўлення асветніцкага грамадскага аб'яднання «Фонд імя Льва Сапегі» Мірослава КОБАСЫ** таксама шмат пытанняў да таго, якой жа павінна быць сістэма мясцовага самакіравання ў Беларусі.

— З аднаго боку, нельга забараняць ствараць асацыяцыі мясцовых Саветаў. З іншага — празмерная колькасць асацыяцый вядзе да абцяжарвання ў выпрацоўцы адзінай пазіцыі, важнай пры дасягненні мэт. Але я адназначна лічу, што заканадаўства, якое датычыцца асацыяцый, развіваць трэба.

Адно з найбольш важных пытанняў — вызначэнне мэты асацыяцыі. Тут таксама ёсць некаторыя абмежаванні. Напрыклад, частка 1 артыкула 121 Грамадзянскага кодэкса і артыкул 7 закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» замацоўваюць мэты, якія асацыяцыя можа паставіць. Але калі я хачу пазначыць мэтай само развіццё сістэмы мясцовага самакіравання, то ці не ўзнікнуць з гэтага пытанні? Кожны з нас пад развіццём мясцовага самакіравання можа разумець нешта сваё. І ў такім выпадку трэба дамаўляцца.

На думку Мірaслава Кобасы, неабходна вызначыцца таксама з інтарэсамі, якія будуць аб'ядноўваць удзельнікаў будучай асацыяцыі.

— Дапусцім, мы стварылі асацыяцыю, якая дзейнічае ў межах вобласці. А ці можа яна цяпер выносіць пытанні рэспубліканскага характару? Яе прадстаўнікоў заканамерна адправяць у абласны выканкам. І калі мы кажам пра інстытуцыянальныя змены, то ў якасці аб'ядноўчага прынцыпу павінна быць нешта іншае. Напрыклад, гэта можа быць, згодна з еўрапейскім досведам, прыналежнасць да аднаго тэрытарыяльнага ўзроўню.

Таксама немалаважнае пытанне колькасці членаў асацыяцыі. Мірaслаў Кабаса лічыць, што для такой невялікай краіны, як Беларусь, можна разглядзець варыянт стварэння адной асацыяцыі. Іншае пытанне, колькі яна будзе ўключаць прадстаўнікоў — гэта залежыць ад таго, колькі тысяч чалавек будзе прадстаўляць адзін дэлегат.

— Немалаважны складнік — дабравольнасць знаходжання. Калі кагосьці прымушаць уступаць у асацыяцыю, то ён у рэшце рэшт уступіць, але нічога не будзе рабіць. І тады асацыяцыя атрымаецца слабай. І куды гэта варта? Я ўпэўнены, што гэтая частка павінна быць дапрацавана. Таксама ёсць пытанне да прынцыпу адзінства. Зразумела, што самакіраванне як з'ява — гэта разнастайнасць поглядаў, думак. Тым, уласна кажучы, яно і каштоўнае. Але групавыя інтарэсы могуць уплываць на адзінства, лабіруючы свае зацікаўленасці. І ці не атрымаецца такая сітуацыя, што чыесьці інтарэсы выйдуць на першы план? Гэта, у сваю чаргу, прывядзе да пэўнай аднабаковасці падыходу.

## Прырост у гандлі — 254 мільёны долараў

**Уладзімір ДРАЖЫН** узначальваў пасольства Беларусі ў Літве з 2006 да 2013 года. За гэты час быў назапашаны велізарны досвед стасункаў органаў мясцовага самакіравання на міждзяржаўным узроўні.

— Я заўжды разумеў, што ў краін Еўрасаюза, з якімі мяжуе Беларусь, можна пераняць многае для развіцця сістэмы самакіравання. Для гэтага трэба было пачынаць актыўную работу. І на працягу трох гадоў мы здолелі заключыць 68 дамоў аб супрацоўніцтве паміж раёнамі і гарадамі Беларусі і Літвы.

Пытанні, якія цікавілі органы самакіравання дзвюх краін, былі вызначаны адразу. Гэта эканоміка, інвестыцыі, сацыяльная сфера. І, вядома, досвед працы ў развіцці сістэмы мясцовай улады.

— Хачу прывесці яскравы прыклад. У Літве яшчэ з савецкіх часоў працуе беларускамоўная гімназія імя Францыска Скарыны. У 2006 годзе, калі я быў прызначаны паслом, то наведаў гімназію ледзь не адразу і звярнуў увагу на нізкі ўзровень стану матэрыяльнай базы. Гімназія патрабавала капітальнага рамонту ва ўсіх сэнсах.

Я звярнуўся да мэраў Мінска і Вільнюса, якія разумелі важнасць гэтага пытання. І мы знайшлі ўзаемапрымальнае рашэнне. Мінгарвыканкам узяў на сябе вырашэнне пытанняў, звязаных з рамонтам памяшканняў, забеспячэннем гімназіі абсталяваннем, мэбляй, камп'ютарнымі класамі. А мэрыя літоўскай сталіцы абавязалася замяніць усе камунікацыі і правесці цеплавую рэабілітацыю будынка. На гэта спатрэбіўся 1 мільён еўра. Гэтая сума была падзелена прапарцыянальна паміж органамі самакіравання дзвюх сталіц. І за два гады гімназія, у якой займаюцца 220 вучняў, была выдатна адрамантавана.

Уладзімір Дражын таксама наладжваў стасункі з Асацыяцыяй самакіраванняў Літвы.

— З 2012 года мы дамовіліся аб правядзенні штогадовых форумаў рэгіянальнага супрацоўніцтва. І першы форум правялі ў Маладзечне, куды запрасілі ўсіх мэраў літоўскіх гарадоў, якія мелі дачыненне да супрацоўніцтва. Мы абмяркоўвалі развіццё эканомікі ў цэлым і інвестыцый у прыватнасці, сацыяльную палітыку. Пасля форумы праводзіліся па чарзе ў Літве і ў Беларусі. Мы прааналізавалі эканамічныя стасункі дзвюх краін пасля пачатку работы ў такім фармаце. І атрымалі прырост у гандлі паміж рэгіёнамі ў 26 %. А гэта 254 мільёны долараў. І зноў жа, вядучая роля ў гэтым належыць менавіта органам мясцовага самакіравання.

## Дыялог — аснова работы

— Вы паставілі столькі пытанняў, што еўрапейскія эксперты адразу і не адкажуць на іх, — заўважыў Аляксандр Папкоў. — Мы дамовіліся, што створым рабочую групу, якая павінна напрацаваць пэўныя падыходы.

Ён адзначыў, што ў законе «Аб мясцовым самакіраванні», здаецца, усё ёсць: маўляў, бяры і працуй. Але вось што датычыцца інструментаў — тут ёсць над чым папрацаваць. Як падкрэсліў старшыня профільнай камісіі, неабходна іх знайсці: як вырашыць пытанні фінансавай устойлівасці, выпрацоўваць зносіны з органамі дзяржаўнага кіравання? Інакш кажучы, — вызначыць ролю мясцовых улад у вырашэнні актуальных праблем жыццезабеспячэння.

— Мы павінны на працягу гэтага і наступнага паўгоддзя сумесна з экспертамі з Еўропы вызначыцца і знайсці інструменты вырашэння гэтых пытанняў, — скіраваў увагу прысутных Аляксандр Папкоў. Калі глыбока паглыбляцца ў праблему, па крупіцах напрацоўваючы пэўны вопыт, тады прыходзіць разуменне, што дыялог — гэта аснова нашай работы.

— Выступаючы перад гэтай аўдыторыяй, старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч казаў, што мы гатовыя ісці настолькі далёка, наколькі гэта магчыма ў вырашэнні пытанняў, якія забяспечваюць жыццядзейнасць нашых тэрыторый, усіх праблем, якія павінны вырашаць органы ўлады на месцах, — рэзюмаваў ён.

**Вольга АНУФРЫЕВА, Валяр'ян ШКЛЕННІК, фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

**Кацярына КУХАРЧЫК, старшыня КТГС «Надзея» (г. Баранавічы):**

*— Камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання «Надзея» з'явіўся ў 2003 годзе на тэрыторыі мікрараёна «Усходні», ён аб'ядноўвае 25 шматкватэрных дамоў, дзе жывуць каля пяці тысяч чалавек.*

*Орган тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання абіраецца на чатыры гады. Актыўныя жыхары мікрараёна такім чынам аб'ядноўваюцца для вырашэння актуальных пытанняў. Механізм працы камітэта «Надзея» досыць просты: пазначаецца праблема, напрыклад жыхары прапаноўваюць устанавіць лаўкі ў дварах або зрабіць ямачны рамонт. КТГС выступае арганізатарам мерапрыемстваў, праводзіць сходы, дзе абмяркоўваецца, наколькі будзе карысная ініцыятыва для жыхароў, і вырашаюць, што трэба зрабіць, якія арганізацыі прыцягнуць, колькі спатрэбіцца на гэта сродкаў і які ўдзел будуць прымаць самі жыхары.*

*Для рэалізацыі ініцыятыў мы выкарыстоўвалі па магчымасці тры крыніцы фінансавання: асабістыя сродкі жыхароў, гранты ЕС і рэсурсы мясцовых органаў улады. Акумуляваць сродкі з розных крыніц дазваляе статус юрыдычнай асобы.*

*Добраўпарадкаванне тэрыторыі пачалі з устаноўкі ліхтароў, паколькі гэтая праблема была самай актуальнай. Добраўпарадкавалі двары, паставілі новыя лаўкі, пабудавалі дзіцячыя і спартыўныя пляцоўкі, альтанкі, адрамантавалі фасады дамоў і дахі. Рэалізавалі гэтую ініцыятыву дзякуючы тэхнічнай дапамозе Сусветнага банка, бюджэтным сродкам і ўзносам грамадзян, якія акумулявалі на рахунак камітэта «Надзея».*

*Арганізацыяй работ займаліся члены КГС, жыхары дамоў і работнікі ЖЭС № 5. Дарэчы, дзеці актыўна прымалі ўдзел у добраўпарадкаванні: фарбавалі арэлі, баскетбольныя шчыты, лаўкі, дапамагалі рамантаваць сталы і лаўкі, упрыгожвалі клумбы каля пад'ездаў. Для падтрымання парадку на тэрыторыі камітэта «Надзея» актывістамі рэгулярна ладзяцца суботнікі, якія праходзяць масава.*

*Там, дзе дзейнічаюць органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, можна бачыць, наколькі актыўна і канструктыўна праяўляюць сябе грамадзяне. Яны не толькі ставяць перад мясцовымі органамі ўлады пытанні, але і самі ўдзельнічаюць у іх вырашэнні.*



# Шклатара не ў фаворы

**Падводзім вынікі нашай апошняй апытанкі, але не заканчваем інтэрактыў з чытачамі на экалагічную тэму.**



Першае пытанне, на якое мы прапаноўвалі адказаць наведвальнікам нашага інтэрнэт-рэсурсу, датычылася ўвядзення грашовай адказнасці для тых, хто не сартуе смецце. Большасць рэспандэнтаў (дзве траціны) аказаліся людзьмі разважлівымі, якія не прывыклі сячы з-за пляча. Яны прапануюць фармат своеасаблівага негалоснага кантракта: спачатку трэба паставіць у кожным двары дастатковую колькасць кантэйнераў для раздзельнага збору адходаў і толькі пасля гэтага пачынаць распрацоўваць штрафныя санкцыі. Галасы тых, хто выступае за ідэю спаганяць грошы з тых, хто выкідвае ўсё ў адзін кантэйнер, і тых, хто так не робіць, падзяліліся прыкладна пароўну. Але ад агульнай колькасці яны набралі па адной шостай.

Восемдзесят працэнтаў апытаных лічаць, што тых, хто сартуе смецце, трэба заахвочваць, у тым ліку і матэрыяльна. Рэшта спадзяецца на альтруізм і свядомасць людзей.

Але якую ж сыравіну здаюць беларусы? Большасць займаецца традыцыйнымі відамі смецця — макулатурай, поліэтыленам і пластыкавымі бутэлькамі, ломам чорных і каляровых металаў, а таксама адпрацаванымі ртутнымі лямпамі і батарэйкамі. Праўда, з топ-ліста нечакана выпала шклатара. Толькі 15 % апытаных ідуць са слоікамі і бутэлькамі ў прыёмны пункт. Цікава, што тут паўплывала? Тое, што вытворцы шырока выкарыстоўваюць пластыкавыя бутэлькі? Зусім мала галасоў, амаль на мяжы статыстычнай памылкі, сабралі зношаныя шыны, тэкстыль, бытавая тэхніка і адпрацаванае масла. Так што, здаецца, ёсць у якім кірунку працаваць на ніве экалагічнай асветы.

Дзве траціны апытаных жывуць у вялікіх гарадах — гэта Мінск або абласныя цэнтры. Дзесяць працэнтаў — у вёсцы. Рэшта жыве ў невялікім горадзе або пасёлку. Пяцідзесяці пяці працэнтам людзей, якія запоўнілі анкету, споўнілася ад 30 да 45 гадоў. Прыкладна чвэрць удзельнікаў маладзейшая за 30 гадоў, яшчэ столькі ж знаходзяцца ва ўзросце ад 45 да 60.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

**Нечаканыя вынікі апытанкі, сапраўды. А мы працягваем інтэрактыўны праект з нашымі чытачамі «Крокі да экалогіі», да якога з задавальненнем далучылася рэдакцыя часопіса «Родная прырода». Разам з калегамі мы падрыхтавалі цікавы тэст, адказаўшы на пытанні якога можна даведацца, наколькі мы «экасвядомыя». Для гэтага скарыстайцеся сваім смартфонам, каб адсканаваць QR-код і перайсці на наш сайт.**

ЖЫЛЛЁ МАЁ

# АДХОДЫ З ХАТЫ, ДВАРА І АГАРОДА

## Новыя сметніцы з'явяцца на кожным беларускім падвор'і

**Раз на тыдзень узімку, летам — тройчы. Прыкладна такі расклад руху смеццявозаў мяркуецца пачаць наладжваць налета ва ўсіх беларускіх населеных пунктах без выключэння. Збіраць свае адходы жыхары індывідуальных дамоў цяпер будуць не ў пакеты, а ў два 120-літровыя пластыкавыя кантэйнеры: для камунальнага смецця і другасных рэсурсаў.**

Такія новаўвядзенні прадугледжаны Перспектыўнай схемай абыходжання з камунальнымі адходамі, якая вось-вось атрымае юрыдычную сілу. Пра жаданне апрабаваць новы спосаб збору смецця на вёсцы і ў сядзібнай забудове гарадоў ужо заявілі камунальныя службы некалькіх рэгіёнаў: Астравецкая ЖКГ, гомельскі «Спецкамунтранс», ЖКГ Гродзенскага раёна, Баранавіцкая гарадская ЖКГ і «Аршанская спецаўтабаза». Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў запланаваў набыццё кантэйнераў і смеццявозаў для іх абслугоўвання для Астравецкага раёна і гарадскога пасёлка Копысь, што на Аршаншчыне.

— Сёлета на выкананне дзяржпраграмы па абыходжанні з адходамі, укараненне новых тэхналогій іх збору і выкарыстання ў якасці другаснай сыравіны, будаўніцтва заводаў і вытворчасцяў па сартаванні і выкарыстанні камунальных адходаў і другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР) выдзелена звыш 60 мільёнаў рублёў, — расказала **Наталля ГРЫНЦЭВІЧ, дырэктар дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».** — Гэтая сума разлічана таксама на ўдасканаленне матэрыяльна-тэхнічнай базы арганізацый, якія збіраюць і выкарыстоўваюць другасныя рэсурсы. Забеспячэнне кантэйнерамі для раздзельнага збору смецця сектара індывідуальнай забудовы — гэта адзін з новых падыходаў да збору адходаў у невялікіх гарадах і на вёсцы.

Падлічыць, колькі ўсяго спатрэбіцца грошай на закупку кантэйнераў і смеццявозаў, не бяруцца пакуль ні Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў, ні Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі. Адзінае, што вядома дакладна: кожная новая 120-літровая сметніца для падворкаў сёння абыходзіцца ў 57 рублёў, а людзі атрымаюць іх бясплатна. Кантэйнеры будуць пластыкавымі, з накрыўкай і на калёсах. Чорныя — для змешаных камунальных адходаў, каляровы — для другаснай сыравіны. У апошні трэба класці шкло, паперу, пластык, цэлафан і ўсё, што вартае перапрацоўкі. Такі змешаны, але асобны збор усё роўна значна палягчае далейшае сартаванне і павышае працэнт вымання карысных адходаў з агульнага складу камунальнага смецця.

Акрамя таго, пяройдуць на выкарыстанне смеццявозаў з задняй загрузкай адходаў. Гэта ўніфікуе закупкі, а таксама рамонт і абслугоўванне транспарту. Плюс лягчэй будзе пад'ехаць да сметнікаў. Кантэйнеры, як мяркуюць спецыялісты, людзі будуць трымаць на падворку, а ў дні прыезду смеццявоза выкочваць іх на вуліцу.

Запланаваны крок у ЖКГ разглядаюць перш за ўсё з экалагічнага і сацыяльнага бакоў. Эканамічныя складнікі адыходзяць на другі план. Нават калі ў вёсцы жыве адзін чалавек, па яго смецце будуць прыязджаць, а павышаць аплату за вываз падчас рэалізацыі новай схемы не збіраюцца, расказалі ў міністэрстве.

— Удасканальванне парадку збору і выдалення камунальных адходаў павінна прадухіліць забруджванне смеццем асяроддзя і зрабіць раздзельны збор ДМР даступным для кожнага чалавека, дзе б ён ні жыў. Неабходна забяспечваць збор усіх відаў камунальнага смецця, уключаючы адходы жыццядзейнасці насельніцтва. Гэта і рэшткі ежы, і смецце з двара, абрэзкі дрэў, зелле з агарода, буйнагабарытнае смецце, электратэхніка, не павінна быць выключэнняў, — мяркуе **Алег ГРУЗІНАЎ, начальнік аддзела водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі і добраўпарадкавання Міністэрства ЖКГ.** — Да таго ж гэта наступная прыступка ў развіцці менталітэту нашых грамадзян у разуменні сваёй адказнасці за тое, што мы пакінем пасля сябе. Гэта прызвычайванне да думкі, што сартаванне смецця, недапушчэнне выкідвання яго ў лесе, паабапал дарог, каля вёсак — задача кожнага чалавека.

**Ірына СІДАРОК.**

КАРЫСНАЕ СМЕЦЦЕ

# 1000 тон макулатуры

## за два месяцы сабралі школьнікі Беларусі

**З верасня па лістапад падчас акцыі «Макулатура ў перапрацоўку. Наш клопат, а не янота» вучні гарадскіх школ сабралі па шэсць кілаграмаў макулатуры, а навучэнцы з сельскай мясцовасці — па 9,5. Арганізатар конкурсу, Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў, вызначыў 12 школ-пераможцаў, кожная з якіх атрымае ў падарунак ноўтбук.**

З 15 верасня па 10 лістапада 447 устаноў адукацыі па ўсёй Беларусі, якія паўдзельнічалі ў акцыі, сабралі 1163 тоны паперы і кардону. Карысную другасную сыравіну перадалі арганізацыям-нарыхтоўшчыкам і на папяровыя фабрыкі краіны, якія выкарыстоўваюць макулатуру для вырабу новай паперы.

Дзякуючы сабранаму школьнікамі аб'ёму макулатуры ўдалося выратаваць ад высечкі такую плошчу лесу, што яе б хапіла на чатыры футбольныя палі. А яшчэ з такой колькасці сыравіны можна вырабіць амаль 23 мільёны сшыткаў па 12 аркушаў, запэўніла **Наталля ГРЫНЦЭВІЧ, дырэктар установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў»:**

— Каб усе ўдзельнікі конкурсу мелі роўныя магчымасці, пры вызначэнні пераможцаў параўноўваліся аб'ёмы сабранай другаснай сыравіны на аднаго навучэнца. А найлепшыя тры ўстановы, якія здалі найбольшую масу макулатуры ў разліку на аднаго школьніка, вызначаліся ў кожнай з чатырох катэгорый у залежнасці ад колькасці вучняў і месца знаходжання школы: у горадзе ці раёне.

Першае месца ў намінацыі «Найлепшая сельская школа з агульнай колькасцю навучэнцаў да 80 чалавек» заняла Вяжноўская базавая школа Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці. Яе вучні — бясспрэчныя лідары сярод усіх удзельнікаў рэспубліканскага конкурсу і найлепшыя — сярод сельскіх школ Беларусі. Вынік гэтых школьнікаў — 61,5 кілаграма макулатуры на аднаго вучня.

Найлепшай сельскай школай з агульнай колькасцю навучэнцаў звыш 80 чалавек у адпаведнай намінацыі стаў Пашкоўскі дзіцячы сад — базавая школа Магілёўскага раёна, выхаванцы якога сабралі па 37,4 кілаграма макулатуры на чалавека.

Галоўны прыз у катэгорыі «Найлепшая гарадская школа з агульнай колькасцю навучэнцаў да 800 чалавек» атрымала сярэдняя школа № 9 г. Віцебска. Тут сабралі 20,6 кілаграма макулатуры на аднаго вучня, што зрабіла ўстанову лідарам сярод гарадскіх школ краіны.

Лідар намінацыі «Найлепшая гарадская школа з агульнай колькасцю навучэнцаў больш за 800 чалавек» — гімназія № 1 г. Баранавічы Брэсцкай вобласці. Яе вучні сабралі 18,5 кілаграма папяровай сыравіны на аднаго школьніка.

Дарэчы, за дзесяць месяцаў сёлета праз сістэму кантэйнернага збору адходаў і пункты нарыхтоўкі другаснай сыравіны сабралі ўжо 291 тысячу тон паперы і кардону, што на 10,5 % больш, чым за такі ж перыяд летась.

**Ірына СІДАРОК.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 20 снежня 2018 года.**